Пралетары, усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 12 (3916)
АЎТОРАК, 13 СТУДЗЕНЯ 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Праверка падрыхтоўкі да веснавой-- прымушае біць трывогу

Трэці рашаючы год пяцігодкі патрабуе далейшага ўзмацненьня бальшавіцкіх тэмпаў разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва. Дасягненьні другога году пяцігодкі і ўдарнага кварталу, рост актыўнасьці і разваліваючыйнага энтузіязму рабочае клясы зьяўляюцца фактарам, які вырашае пытаньне аб магчымасьці выкананьня цалкам і поўнасьцю ўсіх заданьняў, пастаўленых партыяй у 1931 г. Трэба, аднак, каб партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі сапраўды сталі на чале ўзрастаючага энтузіязму і актыўнасьці рабочае клясы, каб гэтыя арганізацыі сапраўды мабілізавалі ўсе сілы і ўсе рэсурсы на выкананьне гэтых задач.

У плянах 1931 г. вялізарнае месца займае сельская гаспадарка, як пастаўшчык сырцу для фабрык і харчоў для рабочае клясы. У гэтай галіне асабліва адказны задачы БССР, якая павінна стаць рэспублікай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Другая бальшавіцкая вясна павінна адыграць рашаючую ролю ў перабудове сельскае гаспадаркі нашае рэспублікі ў гэтым напрамку. Яна павінна адначасова стаць далейшым вялізарным крокам у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, у галіне калектывізацыі. Таму вялікая ўвага павінна быць зьвернута на ход падрыхтоўкі другой бальшавіцкай вясны.

Першая праверка ходу падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі прымушае нас канстатаваць, што справа стаіць нездавальняюча, што трэба неадкладна мабілізаваць сілы, каб дабіцца перапому, каб быйсьці на палі БССР падрыхтаванымі і выканаць заданьні партыі і савецкай улады. Трэба канстатаваць, што ўсе установы, якія адказваюць за ход падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, яшчэ далёка не разварушыліся і пагружаны ў бюракратычную сьпячку, а калі і вядуць сякую-такую «работу», дык гэта работа НЕ ГРАМАДЗКАГА ПАРАДКУ, А ЧЫСТА ГАБІНЭТНАЯ.

Бягучай вясной, паводле плянаў Наркамзему Саюзу, пасеўная плошча павінна быць значна пашырана. Наркамзем Саюзу пастановай аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі ад 24 сьнежня 1930 г. забараніў Наркамземам рэспублік зьмяншаць разьмеры пасеўных заданьняў, а таксама страхавых і насенных фондаў, і г. д.

Наркамзем БССР умудрыўся гэту пастанову Наркамзему СССР абыйсьці.

Да атрыманьня цьвёрдых заданьняў Наркамзему СССР, Наркамзем БССР зацьвердзіў і паслаў у раёны і сельсаветы плян, які прадугледжваў меншую на 33.000 гэкт. супроць заданьняў Наркамзему СССР плошчу засеву.

Наркамзем БССР лічыў немэтазгодным зьмяняць сваю дырэктыву раёнам, паказваючы, што недабор у 33.000 гэкт. будзе пакрыты за кошт перавыкананьня пляну Наркамзему БССР месцамі. Усё было-б у парадку, калі-б Наркамзем БССР ня толькі спадзяваўся на месцы, АЛЕ АРГАНІЗАВАЎ ХВАЛЮ СУСТРЭЧНЫХ ПАСЕЎНЫХ ПЛЯНАЎ НА МЯСЦОХ. На жаль, Наркамзем БССР пальцам аб палец ня ўдарыў, каб мабілізаваць грамадзкую думку наваколь пытаньня аб перавыкананьні яго пасеўных плянаў. Гэта выразна - апартуністычная стаўка на самацёк дала вельмі адмоўныя вынікі, як і трэба было чакаць. ЗАМЕСТ СУСТРЭЧНЫМ БАЛЬШАВІЦКІМ ПЛЯНАМ ВЫКАНАНЬНЯ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, 74 РАЕННЫЯ ЗЕМОРГАНЫ З 100 РАЁНАЎ БССР АДГУКНУЛІСЯ НА НАДЗЕІ НАРКАМЗЕМУ СУСТРЭЧНЫМ, АЛЕ ПАРАЖЭНЦКІМ, КАПІТУЛЯНЦКІМ ПАСЕЎНЫМ ПЛЯНАМ, ДАБІВАЮЧЫСЯ ЗЬМЯНШЭНЬНЯ ЗАДАНЬНЯ Ў АГУЛЬНАЙ ЛІЧБЕ НА 10,5 ПРОЦ АД ЛІЧБЫ, вызначанай Наркамземам Саюзу.

Ганебны, капітулянцкі «сустрэчны» пасеўны плян 74 раённых земорганаў БССР зьяўляецца новай формай праяўленьня правага апартунізму на практыцы. У рэзалюцыях работнікі зямельных органаў галасуюць за бальшавіцкія тэмпы, а на справе зрываюць дырэктывы партыі. Партыйныя арганізацыі павінны моцна ўзяцца за справу і неадкладна выправіць паменшаныя пляны, даючы замест капітулянцкага сустрэчнага пляну пасеўнай кампаніі правых апартуністаў, сапраўдны сустрэчны бальшавіцкі план пасеўнай кампаніі.

У той час, калі адбываюцца спрэчкі аб агульных лічбах пасеўных плошчаў у раёнах, уся работа па разьмеркаваньні заданьняў па асобных гаспадарках—калгасных, саўгасных і індывідуальных—стаіць на месцы. У выніку пасеўныя пляны даведзены ледзь да 55 проц. агульнай колькасьці саўгасаў, да 17,5 проц. агульнай колькасьці калгасаў і ледзь да 2,5 проц. адзіноасобных гаспадарак.

На лепш стаіць справа са зборам насенных фондаў. У калгасах сабрана ледзь 40 проц. заданьня. Па лініі страхавых фондаў толькі 10,5 проц. заданьня. Яшчэ горш у такой арганізацыі, як КСТУ, якое свае заданьні выканала толькі на 2,5 проц. Вядома, у індывідуальным сэктары справа стаіць ня лепш.

Праверка становішча рамонту с.-г. машын гаворыць за тое, што ў гэтай галіне нічога літаральна ня робіцца. Рамонт трактараў пастаўлен з рук вон дрэнна. Не хапае запасных частак. Да трактараў не хапае плугоў, боран сявярак. З 14 майстэрань для рамонту складаных с.-г. машын пачалі працу толькі 7. Аб рабоце арганізаваных пры саўгасах майстэрань па рамонце складаных с.-г. машын няма ніякіх вестак. Аднасіны да машын у саўгасах — барбарскія. У саўгасе Косіна вусенічны трактар неналькі дзён ляжыць у канаве ў некалькіх вярстах ад саўгасу. Адміністрацыя ня ўжывае ніякіх мер да таго, каб даставіць гэты трактар у саўгас. Мала таго, што вусенічны трактар не выкарыстоўваецца на працы на адным з важнейшых зараз вучастку — на вучастку песазагатовак, гэты трактар можа быць цалкам выведзен са строю да веснавой пасеўнай кампаніі.

Становішча з падрыхтоўкай цягавай сілы да веснавой пасеўнай кампаніі трэба прызнаць пагражаючым. У цэлым радзе раёнаў калгасы і саўгасы, разьлічваючы на прыход трактараў, у сьпешным парадку ліквідуюць коняй. «Зьвязда» ня раз сыгналізавала, што ў надыходзячую веснавую пасеўную кампанію ў БССР конь адыграе рашаючую ролю. У той час, калі да пасеўнай кампаніі ў калгасах ня хопіць 20.000 коняй і ў саўгасах — 5.000 коняй, ідзе разбазарваньне коняй. Для прыкладу ўкажам, што калгасы Менскага прыгараднага раёну прадалі 125 коняй, калі для правядзеньня веснавой сяўбы гэтым-жа калгасам патрабуецца каля 250 коняй. Гэта інакш расцэньваць нельга, як простае злачынства.

Падрыхтоўка рабочай сілы таксама знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Да гэтага дня ў радзе устаноў, якім трэба аб гэтым ведаць, нельга дабіцца ўказаньняў, колькі-ж трактарыстаў рыхтуецца ў БССР. Па заўвазе Трактарацэнтру толькі яму трэба будзе больш 5.000 старэйшых і маладшых трактарыстаў, паляводаў і маханікаў. Існуючыя курсы, паводле даных Трактарацэнтру, ахапілі ледзь 2.600 чал. Аддзел кадраў Наркамзему БССР па гэтым пытаньні нічога ня ведае. Загадчык аддзелу кадраў Наркамзему БССР тав. Сушкевіч нават ня ведае ці разглядалася гэта пытаньне на калегіі Наркамзему.

Падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі павінна была пачацца ў першых лічбах сьнежня 1930 г. Цэнтральны Камітэт свачасова даў дырэктывы па гэтым пытаньні. Друк па дырэктывах ЦК свачасова мабілізаваў і завастрыў увагу. Праверка ходу работ, праведзеная ўдарнай брыгадай «Правды» і «Зьвязды», выявіла факты, якія прымушаюць нас біць трывогу. Ужо час узяцца за справу. Па ўсіх фактах апартуністычнай бязьдзейнасьці ў галіне падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі трэба моцна ўдарыць. Усе арганізацыі ў цэнтры і на мясцох павінны неадкладна перабудавацца па-баявому. Заданьні партыі і савецкай улады, якія забясьпечваюць выкананьне пляну 1931, рашаючага году пяцігодкі, павінны быць выкананы ва што-б там ні стала. Усе раённыя партыйныя арганізацыі, усе члены партыі павінны даць рашучы адпор апартуністам і мабілізаваць сілы рабочае клясы і, апіраючыся на калгасьнікаў, беднату і батрацтва, у цесным саюзе з серадняком, стаць на чале барацьбы за выкананьне і перавыкананьне пляну пасеўнай кампаніі, шляхам бальшавіцкага сустрэчнага пляну і гэтым забясьпечыць посьпехі другой бальшавіцкай калгаснай вясны.

Другі дзень судовай камэдыі ў Вільні

Падсудныя выкрываюць цынічную фабрыкацыю працэсу

На другі дзень працэсу з самай раніцы пачынаецца допыт падсудных.

Манархісцкае віленскае «СЛОВА» з незахаваным скрыгатаньнем зубоў піша, што «ўсе падсудныя робяць уражаньне людзей добра падрыхтаваных да абароны, некаторыя сёе-тое запісваюць у блён-ноты. Усе падсудныя трымаюць сябе свабодна і разьвязна. Гавораць ціха паміж сабою, усьміхаюцца, перакідваюцца ўхмылкамі са знаёмымі і сваякамі, што знаходзяцца ў залі суда. Адказваюць старшыні суда на беларускай мове і, як зазначае «Слово», — «калечачы яе (мову) неміпасэрдна русіцызмамі». (Вось для фашысцкага суда і новы яркі «жэчовы» довад «супольнай працы з бальшавікамі».

Першым дапытваецца падсудны б. дэпутат клюбу «Змаганьне» ГАЎРЫЛІК. Ён катэгарычна заяўляе, што беларускі рабоча - сялянскі пасольскі клюб не зьяўляўся экспазытурай ніякай партыі. Сваімі абгрунтаванымі довадамі ён ушчэнт разьбівае цьверджаньні абвінаваўчага акту аб тым, што нібы клюб «Змаганьне» быў надбудоваю кампартыі. Гаўрылік заяўляе, што клюб імкнуўся да зьмены дзяржаўнага ладу ў Польшчы, але ня шляхам узброенага паўстаньня, а шляхам ПАГЛЫБЛЕНЬНЯ СЬВЯДОМАСЬЦІ ШЫРОКІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС. Клюб «Змаганьне» выдаваў усяго толькі дзьве газэты — «На варце» і «Беларуская праца». У Сьвянцянскай акрузе ў часе дадатковых выбараў у сойм у 1929 г. галасавалі за камуністычны выбарчы сьпіс таму, што свайго выбарчага сьпісу клюб ня меў, а гэты сьпіс найбольш ім падабаўся.

Далей Гаўрылік заяўляе, што на мітынгах гаварылі аб тым, аб чым пісалі ў сваіх адозвах. Узносілі воклічы ў гонар СССР, але гэта рабілася ў гонар рабоча - сялянскай дзяржавы. Таварыства ДАПАМОГІ ГАЛАДАЮЧЫМ арганізавалі з мэтай дапамогі і аб'яднаньня сялянскай беднаты.

Другім дапытваецца падсудны б. дэпутат гэтага-ж клюбу І. ДВАРЧАНІН. Ён таксама, як і Гаўрылік, абвяргае закіды абвінавачаньня адносна дзейнасьці клюбу «Змаганьне». Дварчанін заяўляе, што ён ніколі не заклікаў да біцьця паліцыі, што ён прымаў актыўны ўдзел у выпуску газэт, якія выдаваліся клюбам.

Далей дапытваюцца падсудныя б. дэпутаты клюбу «Змаганьне» П. КРЫНЧЫК і Ф. ВАЛЫНЕЦ. Абодва гэтыя падсудныя выступілі з рэзкай крытыкай польскага фашызму, яго калёніяльнай палітыкі на землях Зах. Беларусі, дзікай, проста барбарскай эксплёатацыі беларускіх працоўных мас польскімі памешчыкамі і капіталістамі. Як Крынчык, так і Валынец не прызнаюць сябе вінаватымі. Яны заяўляюць, што ВЫКОНВАЛІ ТОЛЬКІ СВАЕ ДЭПУТАЦКІЯ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ВЫБАРШЧЫКАМІ. Яны разам з іншымі таварышамі гэтага клюбу вялі барацьбу супроць ліквідацыі сэрвітутаў на карысьць памешчыкаў, супроць стальпінскае зямельнае рэформы фашысцкага ўраду — прымусовай хутарызацыі. Яны вялі барацьбу супроць памешчыкаў і фашысцкіх чыноўнікаў, якія крыўдзілі беларускія працоўныя масы, яны бараніілі інтарэсы працоўных мас Зах. Беларусі, якія паслалі іх у сойм.

Наступнымі дапытваюцца супрацоўнікі Цэнтральнага сакратарыяту гэтага клюбу—АСТАПЧЫК, ТАРАСЮК, МІСКА, ПЯТКУН, ЛУКАШЫК і ЖЫТКЕВІЧ. Усе яны не прызнаюць сябе вінаватымі і сьцьвярджаюць, што ні да якой антыдзяржаўнай арганізацыі не належалі.

„Выпадкаў зьбіеньня ў Зах. Украіне было шмат"

Цынічная заява міністра ўнутраных спраў Складкоўскага-Трэпава

ВАРШАВА, 10. Пры абмеркаваньні бюджэту міністэрства ўнутраных спраў у сойме разгарнуліся жвавыя спрэчкі вакол так званага «уціхаміраньня» Заходняй Украіны. Міністар унутраных спраў Складкоўскі і дэпутаты беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам пелі літаральна гімны ў гонар «уціхаміраньня». Складкоўскі таксама вымушан быў прызнаць, што Заходняй Украіне пагражала паўстаньне. Складкоўскі лічыць, што неабходна было ўжываць «сильно действующие средства». Гэтыя «сродкі» заключаліся ў пасылцы атрадаў з паліцэйскіх і ваенных часьцей. Атрады акружалі вёску, выклікалі старасту і валасны савет і патрабавалі выдачы зброі і выбуховых матэрый. З вёскі нікога не выпускалі. Пасьля гэтага рабіліся обыскі. У дамох падазроных асоб ускрывалі падлогу і стрэхі. Усяго арыштавана 1799 чалавек. З іх 1143 былі аддадены пад суд. Сярод арыштаваных — 220 студэнтаў, 360 вучняў сярэдніх школ. «Выпадкаў зьбіеньня было даволі шмат», — прызнае Складкоўскі. «Цяпер у Заходняй Украіне спакойна», — заявіў Складкоўскі. «Урад хацеў устанавіць парадак і дасягнуў сваёй мэты».

ПАУСТАНЬНЕ У БІРМЕ

ПАРЫЖ. Паўстаньне ў Бірме (усходняя правінцыя Брытанскай Індыі з насельніцтвам каля 12 млн. чалавек) працягваецца ўжо некалькі тыдняў. Зрунаваныя аграрным крызісам і грабежніцкімі падаткамі сяляне паўсталі супроць ангельскага панаваньня. «Сапраўдная вайна, — піша цэнтральны орган французкай кампартыі «Юманітэ» — адбываецца зараз у Нiжняй Бірме паміж сялянамі і войскам ангельскага караля. Макданальд хоча, каб на ўсіх канцох Брытанскай імпэрыі ведалі, што нельга безпакарана рабіць замах на суверэнітэт ангельскага імпэрыялізму.

Грымяць гарматы ў раёне Тарауадзі і, ня гледзячы на нераможныя рэляцыі ангельскага камандаваньня, ангельскае войска амаль ня рухаецца з месца. Матуны атрад у 1.000 чалавек, сфармірваны паўстаўшымі сялянамі, наносіць паражэньне за паражэньнем рэгулярнаму войску.

Ангельска - індыйская ўлада выдумляе цэлы рад тлумачэньняў гэтым паражэньням. Спачатку яна заявала, што малярыя робіць вялікія спустошэньні сярод эўрапэйскіх войск, напрывычных да клімату джунгляў. Зараз яны спасылаюцца на дым, які даны пажарамі, узьнятымі ў джунглях ангельскай артылерыяй, якая бамбардуе паўстанцаў. Гэты дым быццам перашкаджае ўрадаваму войску прасоўвацца наперад.

У сапраўднасьці справа ідзе аб паражэньні, якое нанесла ангельскае войска, узброенае і забясьпечанае паводле апошняга слова тэхнікі, у барацьбе з амаль бязбройнымі сялянамі. А між тым, у паўстаўшыя раёны былі пасланы значныя атрады кавалерыі, артылерыі і пяхоты для таго, каб пачаць наступленьне ў шырокім маштабе. А якія на сёньняшні дзень вынікі баёў? Ангельскае войска ня можа рухацца наперад, бо яму, быццам-бы, перашкаджае дым пажараў.

У чым сэнс, аднак, няцяжка здагадацца. Войска ангельскага імпэрыялізму сапраўды мае перад сабой атрад усяго ў 1.000 чал. Гэты атрад даўно ўжо мог-бы быць разгромлены ангельскімі гарматамі і самалётамі, калі-б усё сялянскае насельніцтва правінцыі ня стала на бок паўстаўшых. Ня з тысячай чалавек маюць справу ангельскія палкі, але з мільёнамі. Для гэтых мільёнаў паўстанцы—браты па змаганьні і пакутах. Для войска-жа Макданальда гэта — мільёны ворагаў.

Сяляне трымаюць паўстанцаў у курсе ўсіх перасоўваньняў варожых войск. Сяляне забясьпечваюць і хаваюць паўстанцаў. Зусім зразумела, чаму Макданальд ня хоча прызнаць сапраўднага характару вайны, якую яго войска вядзе ў Бірме.

Магчыма, што, нарэшце, шматлікія і добра ўзброеныя сілы ангельскага імпэрыялізму зломяць супраціўленьне партызан. Ангельскія тэлеграмы паведамляюць ужо, што брытанская артылерыя абстраляла паўстанцаў гураганным агнём і што колькасьць забітых і параненых партызан вельмі вялікая. Але нават у тым выпадку, калі ангельскі імпэрыялізм і задушыць гэта паўстаньне, рэвалюцыйна - вызвалечны рух у Індыі далёка ня спыніцца.

Трэба дадаць, што імкнецьне задушыць паўстаньне ў Бірме дыктуецца ангельскаму «рабочаму» ўраду яшчэ і тым, што ў Бірме знаходзяцца буйнейшыя ў Індыі нафтавыя крыніцы, якія належаць «Брытанскай нафтавай кампаніі», якая ўваходзіць у гіганцкі ангельскі нафтавы трэст: «Роял Дэтч Шэль». На чале гэтага трэсту стаіць вядомы Дэтэрдынг.

Чырвоная армія Кітаю застаецца непераможнай

Ангельскі імпэрыялізм расчараваны сваім кітайскім васапам

ШАНХАЙ. Ангельскі консул у Наккіне атрымаў прадпісаньне з Англіі зьвярнуцца ў міністэрства замежных спраў з заявай, што ангельскае пасольства расчаравана тым, што кітайскі блёк ня здолеў ліквідаваць камуністычнай небясьпекі.

Заява консула выклікана, як відаць, тым, што прайшло ўжо 3 месяцы, на працягу якіх Наккін абяцаў зьнішчыць кітайскія Чырвоныя арміі, а, між тым, барацьба з Чырвоной арміяй застаецца бязрэзультатнай. (ТАСС)

Масавыя арышты рэвалюцыйных рабочых у Лодзі

ВАРШАВА. Пад загалоўкам «Камуністам не ўдалося выклікаць забастоўкі ў Лодзі» сёньняшняя буржуазная прэса паведамляе аб арышце забастовачнага камітэту, арганізаванага членамі прафсаюзаў у Лодзі. Камітэт быў арыштаваны ў часе яго пасяджэньня, у якім прымала ўдзел 68 чал. З ліку затрыманых вызвалена было толькі 10 чал., іншыя перададзены ў распараджэньне судовых органаў.

Кантрольныя лічбы СССР

зрабілі вялізарнае ўражаньне на буржуазію Захаду

БЭРЛІН. Перадавы артыкул «Бэрлінэр Бэрэзнцэйтунг» можа даць прадстаўленьне аб тым вялізарным уражаньні, якое зрабілі ў нямецкіх буржуазных колах агалошаныя на сэсіі ЦВК СССР кантрольныя лічбы на 1931 год. Газэта заяўляе, што адмаўляць у сучасны момант шпаркі эканамічны ўздым Савецкага Саюзу ва ўсіх галінах прамысловасьці ня прыходзіцца. Нясумненна, бальшавікі могуць дабіцца такіх рэзультатаў, якія наўрад ці даступны іншым краінам, уладаючым зьяўзяваючымі іх буржуазнымі традыцыямі. Толькі з гэтага пункту погляду, — гаворыць далей газэта, — можна зразумець паданы народным камісарам фінансаў Грынько адзіны фінансавы плян, ахапляючы каля двух трацей усяго народнага даходу, а іменна 32 мільярды рублёў з агульнай сумы 49 мільярдаў рублёў. Баланс дзяржаўных выдаткаў і прыбыткаў, прадстаўлены маскоўскім урадам, нішто іншае, як «ісьціна і прапаганда». Гаспадарчыя колы Амэрыкі і Зах. Эўропы зтурбаваны адчувальнай ужо і зараз, а яшчэ больш небясьпечнай у будучым, канкурэнцыяй савецкай гаспадаркі. (ТАСС)

Заклік да вайны супроць СССР

Правакацыйнае выступленьне прафэсара Віленскага унівэрсытэту

ВАРШАВА, 10. У Вільні адбыўся банкет у гонар былога міністра зямельных рэформ Станевіча. На банкеце выступіў прафэсар віленскага унівэрсытэту ЛІМАНОЎСКІ З ПРАВАКАЦЫЙНАЙ ПРАМОВАЙ, У ЯКОЙ ЗАКЛІКАЎ ДА ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР. «Вільня зьяўляецца геаграфічным цэнтрам на тэрыторыі паміж Нёманам, Дняпром, Дзьвіной і Прыпяцьцю, — заявіў Ліманоўскі. Але гэты цэнтр знаходзіцца ў стане летаргічнага сну. Пора нам праснуцца. МЫ ПАВІННЫ САБРАЦЬ ВАКОЛ СЯБЕ ЎСЕ ЗАБРАНЫЯ Ў НАС ЗЕМЛІ. Мы ня можам заставацца ў якасьці калідору, які аддзяляе Нямеччыну ад Расіі. Мы цьвёрда ведаем, што мы павінны рабіць. СЁЕ-ТОЕ ЎЖО ЗРОБЛЕНА. Рэшткі нам прадстаіць зрабіць. Мы паступова пачынаем задыхацца ў гэтым калідоры і ня выконваем нашай гістарычнай ролі. Вялікадзяржаўная Польшча, гэта тая Польшча, якая «вскрестнет» у старой Рэчы Паспалітай, ля старых межах. НАШЫ РАЗРАКУНКІ З СССР ЯШЧЭ НЕ ПАКОНЧАНЫ. Польшча выкавала моцную зброю супроць рускага духу. Хіба-ж гэта зброя павінна быць здана ў архіў гісторыі? Мы ведаем, што Варшава на вырашыць пытаньня аб аб'яднаньні нашых зямель. Але і ў нас ёсьць у Варшаве голас — гэта голас маршала Пілсудзкага. Вільня праз Пілсудзкага падрыхтоўвае ў Варшаве стварэньне будучай вялікадзяржаўнай Польшчы». (ТАСС).

Сялянства фашысцкай Польшчы

хоча ведаць праўду пра СССР

ВАРШАВА. У адным з павятовых гарадоў Верхняй Сілезіі адбыўся многалюдны мітынг малазямельных сялян. На мітынгу з усіх павятовых вёсак сабралася больш, чым 3 тысячы сельска-гаспадарчых рабочых. Паліцыя прабавала разагнаць мітынг, што ёй, аднак, не ўдалося. Калі выступіў з прамовай дэпутат сялянскай самаданамогі Ткачоў, сяляне патрабавалі, каб ён расказаў аб Савецкім Саюзе. Ткачоў абмаляваў гаспадарчы і культурны рост СССР. Удзельнікі мітынгу вынесьлі адпаголосную рэзалюцыю, у якой пакляліся пайсьці супроць фашысцкага блёку і змаганьня з сацыял-фашызмам. Рэзалюцыя заклікае масы да змаганьня з інтэрвэнцыяністкімі плянамі міжнароднага імпэрыялізму. Згодна патрабаваньню сялян у рэзалюцыю ўнесена патрабаваньне аб скасаваньні запазычанасьці сялянскай беднаты. (ТАСС.)

Зьлёт ударнікаў калгаснага будаўніцтва

Прайшоў роўна год з таго часу, як апублікавана пастанова Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б), якая вызначыла тэмпы калектывізацыі СССР і задачы паваротy ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Партыя па-бальшавіцку, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, на працягу ўсяго порыяду няўхільна праводзіла гэту гістарычную пастанову ў жыцьцё, змагалася за суцэльную калектывізацыю. І на гэтым фронце партыя дабілася гігантскіх посьпехаў.

Гэтыя посьпехі сталі магчымы толькі таму, што партыя бязьлітасна змагалася супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе — правых апартуністаў, якія, зьяўляючыся агентурай кулацтва ў радах партыі, выступалі супроць лёзунгу суцэльнай калектывізацыі і супроць палітыкі партыі ліквідацыі кулака на базе суцэльнай калектывізацыі. Партыя дабілася гэтых посьпехаў толькі таму, што давала адначасова рашучы адпор рэшткам недабітых элемэнтаў контр - рэвалюцыйнага трацкізму і «левым» загібшчыкам, якія ў ажыцьцяўленьні лёзунгу партыі аб суцэльнай калектывізацыі груба парушалі ленінскія прынцыпы добраахвотнасьці меры пакіраваныя супроць кулака, распаўсюджвалі на серадняку, а часамі нават і на беднату. «Лявацкія» элемэнты гэтым самым лілі ваду на млын правых апартуністаў, гралі на руку кулацтву і яго антысавецкай агітацыі.

Забясьпечаньне павароту ў палітыцы партыі, забясьпечаньне бальшавіцкіх тэмпаў калектывізацыі, вызначаных пастановай ЦК, патрабавала ад партыі павышэньня бальшавіцкай пільнасьці, ідэйнага і арганізацыйнага ўзмацненьня вясковых партарганізацый, перабудовы іх работы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, патрабавала павышэньня пралетарскага кіраўніцтва калектывізацыяй.

Вытворчыя партколектывы і шырокія масы пралетараў гораду адказалі на гэтыя патрабаваньні канкрэтнай справай — пасылкай 25.000 лепшых пралетараў на кіруючую работу ў калгасы. Гэта вялікае палітычнае мерапрыемства адыграла вялізарнае значэньне ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Рабочыя - «25-тысячнікі» на фронце калгаснага будаўніцтва ў асноўнай сваёй масе сябе поўнасьцю апраўдалі. «25-тысячнікі» далі сапраўды бальшавіцкія ўзоры пралетарскага кіраўніцтва калектывізацыяй, ажыцьцяўленьня на практыцы генэральнай лініі партыі і змаганьня супроць кулацтва. Савецкі друк на сваіх старонках падаваў шматлікія прыклады бадзёрай работы пралетараў, пасланых на вёску. І там, дзе мясцовыя партарганізацыі і ўсе іншыя савецкія, прафсаюзныя і грамадзкія установы і арганізацыі склалі спрыяючыя ўмовы для работы «25-тысячнікаў», там «25-тысячнікі» замацаваліся на рабоце і набылі вялікі вопыт пралетарскага кіраўніцтва калектывізацыяй, перадаючы яго шырокім масам батракоў і калгасьнікаў-актывістаў, якія наступаюць на кіруючыя пасты ў калгасным будаўніцтве. Сацыялістычныя мэтады працы прамысловасьці «25-тысячнікі» перанесьлі ў масы калгасьнікаў. І яны, гэтыя масы, праз сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва паказалі магутнасьць калектыўнай працы. Згуртоўваючы масы калгасьнікаў, беднаты і серадняку-адзіноасобнікаў вакол асноўных задач партыі, «25-тысячнікі», пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, правялі вялікую работу на ажыцьцяўленьні важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній на вёсцы.

Пры пасылцы «25-тысячнічаў» у вёску знайшліся людзі, якія скэптычна глядзелі на гэта мерапрыемства, знайшліся людзі, якія імкнуліся давесьці нездольнасьць рабочых кіраваць справай калектывізацыі таму, што рабочы, напаўны на вёску, дрэнна арыентуецца ў абстаноўцы, не знаёмы з сельскай гаспадаркай і г. д. Усе гэтыя, па сутнасьці, апартуністычныя ацэнкі, якія горача падтрымліваліся кулацкімі элемэнтамі, дашчэнту разьбіты практычнай работай «25-тысячнікаў».

Сёньня адкрываецца Ўсебеларускі зьлёт ударнікаў сацыялістычных паляў — рабочых - «25-тысячнікаў». На парадку дня зьлёту — рад важнейшых, вялікай палітычнай важнасьці пытаньняў.

Па-першае, «25-тысячнікамі» будзе абмеркавана пытаньне аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і чарговых задачах сацыялістычнага будаўніцтва. Пастановы пленуму, які адбыўся на рубяжы другога і трэцяга году пяцігодкі, маюць выключна важнае палітычна - гістарычнае значэньне. Пленум вызначыў грандыёзную праграму яшчэ больш шпаркага разгортваньня сацыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Тэмпы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, пры ўмове іх поўнага забясьпячэньня, даюць магчымасьць «завяршыць пабудаваньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР». Пленум вызначыў шляхі разьвіцьця кааперацыі савецкай краіны, паставіў рад задач на палянцэньні рабочага забясьпячэньня. У задачы «25-тысячнікаў» уваходзіць перадаць шырокім масам калгасьнікаў, беднаты і серадняку - адзіноасобнікаў усю веліч значэньня пастаноў пленуму і іх сымбола - палітычны і прынцыповы зьмест, арабіць адабыткам разуменьня шырокіх працоўных мас вёскі.

Бальшавіцкая вясна трэцяга году пяцігодкі адыгрывае рашаючае значэньне ў справе ажыцьцяўленьня праграмы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў 1931 годзе. Задачы другой бальшавіцкай вясны — адно з важнейшых пытаньняў, спэцыяльным абмеркаваньнем якога будзе займацца зьлёт. Кожны «25-тысячнік», вылучаны пралетарыятам на практычнае ажыцьцяўленьне задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, паніпен выразна разумець тыя задачы, якія партыя паставіла перад пасеўнай кампаніяй, а тым, каб, мабілізаваўшы вакол гэтых задач масы, поўнасьцю выканаць і перавыканаць вызначаныя пляны сяўбы.

Зьлёт абмяркуе пытаньне сувязі прадпрыемстваў з «25-тысячнікамі», праверыць, наколькі мясцовыя партарганізацыі склалі спрыяючыя ўмовы для работы «25-тысячнікаў» і сваім кіраўніцтвам дапамагалі ім у ажыцьцяўленьні задач партыі. Наконт сувязі прадпрыемстваў, вылучаўшых «25-тысячнікаў», са сваімі таварышамі пасланымі на вёску, трэба сказаць, што гэта сувязь да гэтага часу была яўна нездавальняючая. Бытворчыя парткалектывы і прафарганізацыі не надавалі гэтаму пытаньню таго значэньня, якое яму належыць.

Разам з гэтым, трэба падкрэсьліць, што рад асобных раённых партарганізацый і партчэек, аб чым «Зьвязда» ня раз свачасова сыгналізавала, ня склалі спрыяючых умоў для рабочых-«25-тысячнікаў» і дрэнна кіравалі іх работай. У Журавіцкім раёне з «25-тысячнікамі» ня было праведзена ні аднэй нарады. Мясцовыя арганізацыі ў рабоце не дапамагалі. «25-тысячнікі» перагружаны рознымі абавязкамі, што перашкаджае ў правядзеньні сваёй асноўнай непасрэднай работы. Падобнае становішча мы можам наглядаць і ў некаторых іншых партарганізацыях.

У тых раёнах, дзе для «25-тысячнікаў» ня склалі спрыяючых умоў, дзе не дапамагалі ў іх рабоце, там мы бачым, што «25-тысячнікі» або вярталіся назад на вытворчасьць, або правальваліся на рабоце. Такія прыклады мы маем у Бяльніцкім, у Тураўскім і некаторых іншых раёнах. І больш таго, у Капыльскім раёне мы мелі факты абураючых адносін да «25-тысячнікаў». Былы сакратар райкому дайшоў да таго, што проста заяўляў «25-тысячнікам»: «Мы вас экспартавалі ў раён і можам імпартаваць назад без партыйнага білету». У гэтым-жа раёне быў адданы пад суд «25-тысячнік» тав. Чырнун толькі за тое, што, будучы старшынёю сельсавету, не прадставіў вестак аб ходзе збожжазагатовак. На гэтыя факты партыйныя арганізацыі свачасова рэагавалі і з іх трэба зрабіць пэўны ўрок.

Кааперацыйныя аб'яднаньні надзвычай дрэнна забясьпечвалі «25-тысячнікаў» прамтаварамі і прадуктамі спажываньня ў радзе раёнаў: Асьвейскім, Лядзянскім, Клічаўскім, Рагачоўскім, Лёзьненскім і інш., між тым, як гэта вельмі адмоўна адбівалася на пасьпяховай рабоце «25-тысячнікаў». У Старадароскім раёне мы маем такі факт, калі «25-тысячнік» пры перакіданьні з аднаго калгасу на работу ў другі ня можа пераехаць толькі таму, што не забясьпечан цёплай вопраткай. Падобныя факты мы можам сустрэць і ў радзе іншых раёнаў.

«25-тысячнікі» пасьля свайго зьлёту яшчэ больш узмоцняць пралетарскае кіраўніцтва калектывізацыяй, яшчэ з большай энэргіяй будуць ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, узмоцняць пралетарскі націск на кулацтва да поўнай яго ліквідацыі, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі. Пасьля свайго зьлёту «25-тысячнікі» яшчэ з большай актыўнасьцю будуць змагацца за «абсалютную перавагу сацыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі элемэнтамі ў вёсцы».

А. К—н.

15-га студзеня, у 7 гадз. увечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты «РАБСЕЛЬКОР» (Савецкая вул. № 63, трэці паверх)

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА

прадстаўнікоў Культсэктару ЦПСПБ, ЦП саюзаў, Белдзяржкіно, Белкаапсаюзу, масавых аддзелаў цэнтральных газэт, прадстаўнікоў рэдкалегій менскіх шматтыражак і ўсіх фота-аматараў менскіх прадпрыемстваў па пытаньні

„Фото-здымак на службу сацыялістычнаму будаўніцтву"

Рэдакцыя газэты «Рабселькор».

АДНАРАЗОВЫ ЗБОР

з сельскага насельніцтва на патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва

ПАСТАНОВА Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Б

З ленінскай непрымірымасьцю змагацца

супроць усякага нігілізму, самацёку, апартуністычных скажэньняў у правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі і ўлады

Копыльскі райком партыі не дае адпору вылазкам вялікадзяржаўных шавіністаў. Рупары контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму- Высілеўскія, Парэчыны, Гаўрукі--працягваюць свае нацыянал-дэмакратычныя тэорыйкі

Хто хаця на хвіліну спыняе барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам— галоўнай небясьпекай, беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі—той фактычна дапамагае клясаваму ворагу

На барацьбу

з ухіламі у нацпытаньні

Бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва, вялізарныя посьпехі, якіх дабілася наша партыя і савецкая ўлада ў гапіне няўхільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, усё больш зьнішчаюць эканамічную і культурную адсталасьць БССР, з каранямі вырываюць апошнюю базу для шавінізму ўсіх колераў.

Аднак, даны этап абвастрэньня клясавай барацьбы ў перыяд трацяга рашаючага году пяцігодкі ня можа не выклікаць вострых праяў шавінізму, якія тармозяць на асобных участках справу сацыялістычнага будаўніцтва.

Клясавы вораг і ў першую чаргу пікавідуемае ў раёнах суцэльнай калектывізацыі кулацтва пранёўле шалёнае супраціўленьне нашаму сацыялістычнаму наступленьню, актывізуе сваю дзейнасьць, накіраваную да зрыву нацыянальнай палітыкі нашай партыі.

Вось чаму пытаньне яшчэ больш рашучай непрымірымай барацьбы за няўхільнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, барацьбы з скажэньнямі яе, з вялікадзяржаўным шавінізмам, як найбольш нябезьпечным, беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі набывае зараз асаблівую палітычную вострасьць.

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б абавязаў партыйныя арганізацыі яшчэ больш узмацніць работу па сапраўдным правядзеньні ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі, абвясьціў нацыянал-шавіністычныя погляды несумяшчальнымі з прабываньнем у партыі.

Аднак, як радзе рэнёў мы маем і да сёньняшняга дня ажыцьцёўленьне пастаноў партыі. Праведзены па дырэктыве кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б месячнік беларусізацыі ў радзе раёнаў (ШКЛОЎСКІ, СЕНЬНЕНСКІ, ЮРАВІЦКІ, КАПЫЛЬСКІ, АРШАНСКІ) зьведзен да формальнага вынясеньня пастановаў аб правядзеньні месячніка. У радзе арганізацый (ВІЦЕБСК) мы маем буйнейшыя прарывы ў рабоце па абслугоўваньні нацэнзэньцаў. Пад носам партыйных ячэек вялікадзяржаўныя шавіністы з БЕШАНКОВІЦКАГА ТРАНСБУДУ адмаўляюцца прымаць дакумэнты і паперы, напісаныя на беларускай мове, а ў ХОЦІМСКАЙ тэлеграфнай конторы адмаўляюцца прымаць тэлеграмы, напісаныя па-беларуску. Ніхто і зараз не рэагуе на такую «прапаганду» дырэктара ТАЛАЧЫНСКАЙ гарбарні Захаржэўскі аб тым, што калі «перавядзем працу на беларускую мову, дык вынізім тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва». Там-жа, у Талачынскім раёне, мы мелі макровая вялікадзяржаўныя выступленьні з боку агранома калгасаюзу ВАКЕРА, некаторых работнікаў райсельбанку, і ня тэзіс выступленьні нішкага рэгаваньня мясцовых партыйных арганізацый мы ня бачылі.

Такія індыферэнтныя адносіны да пытаньняў нацыянальнай палітыкі, яўнае ігнараваньне яе з боку вышэй паказаных партыйных ячэек і арганізацый ацэньваюцца правай махровага вялікадзяржаўнага шавінізму. Ім павінен быць дан самы рашучы бязьлітасны адпор. Тым, што супраціўляюцца правядзеньню беларусізацыі ў нашым апараце павінны быць зьняты з работы, прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Асабліва ганебнае скажэньне нацыянальнай палітыкі, якія праявы вялікадзяржаўнага шавінізму мы маем у КАПЫЛЬСКІМ раёне. Там пад носам партыйнага камітэту цімашэнкае спажывецкае таварыства доўгі час разьмяркоўвала тавары... па нацыянальным прынцыпе (гл. допіс аб Капылі). Там з боку нават адказных работнікаў мы маем яркія выпады супроць правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. На сходзе партыйнай ячэйкі Капыля мы чулі выступленьні камуністаў (Сігінар, Хацілаў, Хаюцін), якія мяжуюцца з выступленьнямі нашага клясавага ворага. І па сёньнішні дзень адказныя капыльскія работнікі ВАРЛАМАЎ, КУЗЬНЯЦОЎ, КІРСАНАЎ адмаўляюцца бываць беларускую мову. На ўсе гэтыя факты РАЁННАЕ КІРАЎНІЦТВА НЕ РЭАГАВАЛА, правяла аўшае прымірэнцтва да вялікадзяржаўнага шавінізму. Мы лічым, што такія кіраўнікі, якія ігнаруюць правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі — «сустаўной часткі прапетарскай рэвалюцыі»,—ня могуць пасьпядоўна і няўхільна праводзіць у жыцьцё генэральную лінію нашай партыі. Партыйная арганізацыя Капыльшчыны павінна сказаць сваё слова, ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ТЫХ, ХТО сьвядома ўхіляецца ад беларусізацыі.

Калі самым рашучым чынам мы павінны змагацца з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, то гэта не азначае, што можна асабіць змаганьне супроць беларускага, а таксама польскага, яўрэйскага і іншых шавінізмаў.

Беларускі контр - рэвалюцыйны нацыянал - дэмакратызм, ствараючы агульны фронт дзейнасьці з беларускім нацыянал - фашызмам Зах. Беларусі, актывізуе сваю барацьбу за капіталістычную рэстаўрацыю Савецкай Беларусі. Выкрыцьцё ДПУ Бел. контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацдэмаў не азначае, што карэньні беларускага нацыянал-дэмакратызму вырваны. БАРАЦЬБА З КОНТР - РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ НАЦЫЯНА - ДЭМАКРАТЫЗМАМ ПАВІННА ВЕСЬЦІСЯ САМАЯ РАШУЧАЯ, САМАЯ БЯЗЬЛІТАСНАЯ.

Сёньнішнія матар'ялы аб новых вылазках нацыянал - дэмакратаў на навуковым фронце гаворыць, што дзейнасьць Луцкевічаў, Некра шэвічаў, Лёсікаў ня спыняецца. Рупары беларускіх нацдэмаў не разбраіліся. Аб гэтым гаворыць выступленьне «гісторыка» ВАСІЛЕЎСКАГА на сходзе аршансіх настаўнікаў, які абараняў памылкі Ігнатоўскага, настойваў на тым, што «беларускія нацдэмы таму змагаюцца, што добра ня вывучылі «капітал»; аб гэтым гаворыць «тэарэтыка» ПАРЭЧЫНА на пасяджэньні т-ва марксыстаў - дзяржаўнікаў, дзе гэты «тэарэтык» бараніў нацыянал-дэмакратычныя ўстаноўкі адносна сутнасьці нашай прапетарскай дзяржавы. У ГОРАЦКАЙ с.-г. АКАДЭМІІ мы маем ажыўленую дзейнасьць беларускіх нацдэмаў у галіне беларусазнаўства.

Рупары беларускіх нацдэмаў павінны атрымаць належны бальшавіцкі адпор. Партыя не дапусьціць ніякага нігілізму, ніякага самацёку ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Партыя не дапусьціць ніякага прымірэнцтва да барацьбы з шавінізмамі і рознымі ўхіламі ад ленінскай лініі ў гэтым пытаньні. Усякае скажэньне ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі — ёсьць апартуністычная справа, ёсьць практычная дапамога клясаваму ворагу.

Не скажаць сутнасьці месячніка беларусізацыі

Аб тым, як праходзіў месячнік беларусізацыі ў гарадох, ужо адзначалася на нарадзе пры ЦК КП(б)Б. Канстатавана, што да гэтай важнейшай задачы азьяцыяўленьня нацпалітыкі партыі з боку некаторых партарганізацый, асабліва прафарганізацый наглядаюцца фармальныя адносіны.

Трэба сёньня адзначыць, што і на вёсцы з боку некаторых партарганізацый аддаецца слабая ўвага гэтай працы.

Нагляцюца выпадкі, калі партыйнае кіраўніцтва пры правядзеньні месячніка беларусізацыі абмяжоўваецца вылучэньнем камісіі, рознымі даручэньнямі савецкім арганізацыям і г. д., зводзіць гэту работу толькі да праверкі стану ўладаньня беларускай мовай.

Вось характэрныя пастановы некаторых райкомаў КП(б)Б. **Асілавіцкі райком** пастанаўляе: «Для праверкі беларусізацыі склясьці камісію з 5 асоб» і на гэтым супакойваецца. Такія-ж пастановы вынесены **Астрашыцка-Гарадзецкім, Дрысенскім, Чашніцкім і радам іншых райкомаў.**

Надзвычай цікавая пастанова **Шклоўскага райкому**, у якой гаворыцца: «Да выкананьня пастановы пленуму аб правядзеньні беларусізацыі лічыць (нават лічыць толькі) незбходным правесьці месячнік беларусізацыі».

Сеньненскі райком КП(б)Б пастанавіў: «Правесьці праверку беларусізацыі з 1 сьнежня, усім партыйцам прыняць удзел і аказаць дапамогу РКК у гэтай працы».

Ёсьць і такія пастановы, напрыклад, **Юравіцкага райкому КП(б)Б** у якога месячнік зводзіцца толькі да выкрыцьця контр - рэвалюцыйнай дзейнасьці нац.-дэмакратаў. 2 сьнежня РК пастанаўляе: «Правесьці сходы працоўных мас сялянства і членаў саюзу, на якіх выкрыць контр - рэвалюцыйную дзейнасьць нац.-дэмакратаў».

Гэтай пастановай РК і абмежаваўся.

Некаторыя раённыя партарганізацыі не ўявілі сабе, што месячнік павінен зьявіцца штурмком узмацненьня і далейшай напулярызацыі нацыянальнай палітыкі партыі сярод партыйных, камсамольскіх і беспартыйных працоўных мас, штурмком для ўзмацненьня барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, контррэвалюцыйным беларускім нац.-дэмакратызмам і інш. шавінізмамі, што месячнік павінен ўзмацніць работу па абслугоўваньні нацыянальных меншасьцяй на іх роднай мове, узмацніць беларусізацыю нашых апаратаў, разгарнуць будаўніцтва беларускай культуры нацыянальнай на форме і пралетарскай па зьмесьце. Большасьць райкомаў недаацаніла палітычнага значэньня месячніка, зьвяла яго да фармальнага вынясеньня пастановаў аб яго правядзеньні.

Бяздушнаму фармалізму ў выраўненьні галоўнейшых задач нашай партыі, нацыянал - апартунізму раённых партыйных арганізацый павінны абвясьціць рашучую барацьбу і даць адпор усім тым, хто пад шыльдачкай фармальных пастаноў дапускае зрыў важэйшаўленьня нацыянальнай палітыкі партыі.

Пецярэнка.

Марксысты-дзяржаўнікі

СУПРОЦЬ ПАРЭЧЫНШЧЫНЫ*)

Ужо савецкая грамадзкасьць чытала якага нацыянал-дэмакратызму, што на старонках газэты «Зьвязда» аб нацыянал-дэмакратычных установках у тэорыі дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР вядомага рупара нацыянал-дэмакратызму Г. Парэчына ў яго артыкуле «Ідэя беларускай дзяржаўнасьці перад утварэньнем Савецкай Беларусі».

Гэты «тэарэтык» дзяржаўнага будаўніцтва стварыў цэлую тэорыю ў сваіх працах прымірэньня клясавай барацьбы па вёсцы, даў нацыянал-дэмакратычныя ўстаноўкі адносна сутнасьці нашай прапетарскай дзяржавы.

Таварыства марксыстаў-дзяржаўнікаў, якое толькі ў гэтыя месяцы арганізавалася, зрабіла першы крок да выяўленьня ворожых буржуазных нацыянал-дэмакратычных тэорый у пытаньнях савецкага будаўніцтва і права. На пасяджэньні 24 сьнежня г. Канапліным зроблен першы даклад аб становішчы на тэарэтычным фронце на пытаньні савецкага будаўніцтва і права і аб задачах таварыства марксыстаў-дзяржаўнікаў. У дакладзе вусім правільна былі асьветлены пытаньні вялікадзяржаўнага шавінізму, якія мелі месца з боку некаторых прафэсароў (Крыльцоў, Шыраеў) у іх працах на праве, а таксама і беларускага нацыянал-дэмакратызму ў працах Гуткоўскага і Парэчына. Было паказана, як «тэарэтык» зямельнага права Вішнеўскі ўгрунтоўваў прынцыпаўгчыну. Быў дан цэлы рад прыкладаў буржуазнага асьветленьня праўных пытаньняў (праф. Трэдыгер, праф. Яўціхіеў і Саўнскі).

Усе гэтыя прарывы, якія мелі месца ў тэорыі па савецкім будаўніцтве і праве, павінны быць выкрыты да канца. Аднак, як гэта нацьвердзілі спрэчкі на дакладу, некаторыя з тых зубоў, якія праводзілі буржуазную ідэалёгію, і на сёньнішні дзень абараняюць свае погляды. Прысутны на гэтым сходзе Гуткоўскі фармальна, як быццам, «прызнаў» свае памылкі, стараючыся галоўную віну пераваліць на іншых нацыянал-дэмакратычных асоб, удзельнікаў па складаньні праўнай тэрміналёгіі (Лёсік, Некрашэвіч і інш.), а сабе ён лічыць «тэхнічным» выканаўцам іх дырэктыў, «маленькай» асобай у руках нацыянал-дэмакратаў. Такое «прызнаньне» Гуткоўскага нас ня можа задаволіць, бо такія паводзіны яго, як звальваньне віны на іншых, нам лішні раз даказваюць, што Гуткоўскі яшчэ не ўявіў тэй шкоднасьці працы, якую ён праводзіў пры ўкладаньні праўнай тэрміналёгіі.

З боку Парэчына мы мелі іншае. За мест таго, каб прызнаць свае палітычныя памылкі ў сваіх працах, вырыць тыя нацыянал-дэмакратычныя буржуазныя ўстаноўкі, якія ён праводзіў у папярэдніх сваёй навуковай дзейнасьці, ён у сваім выступленьні стаў на шлях абароны сваіх старых нацыянал-дэмакратычных пазыцый і з усёй прысутнай яму ўпартасьцю палаў на дакладчыка, угрунтоўваючы правільнасьць сваіх канцэпцый.

Чым характэрна для нас выступленьне Парэчына? Яно характэрна тым, што лішні раз даказвае тое, што рупары нацыянал-дэмакратызму на ўступаюць сваіх пазыцый, што яны ня спыняюць сваёй дзейнасьці ў напрамку барацьбы з лініяй партыі ў нацыянальным пытаньні. Чым, калі не дэманстрацыя супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі, зьяўляецца заява Парэчына на сходзе аб тым, што ў яго працах няма «нікім будаўніцтве в правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе а «левымі» вагібамі, а таксама в прымірэнчымі адносінамі да ўхілаў ад ленінізму.

Трэба лічыць вусіх вынарміальным, што да гэтага часу імпы марксысты-прававікі не далі пікоўнага артыкулу ў часопісях БССР і СССР аб буржуазных нацыянал-дэмакратычных скажэньнях на ідэалёгічным фронце на савецкім будаўніцтве і праве ў БССР. Такое маўчаньне з боку марксыстаў у перыяд абвостраных жорсткай клясавай барацьбы на ідэалёгічным фронце трэба распэньваць, як прымірэнчыя адносіны да буржуазнай і нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі, якою прасякнуты ўсе творы буржуазных ідэалёгаў-юрыстаў на савецкім будаўніцтве і праве. Калалей з такім становішчам мірыцца нельга, бо як правільна зазначыў т. Сталін, «нялёгка цяжка праузмець, што без непрымірымай барацьбы з буржуазнымі тэорыямі на базе марксыцка-ленінскай тэорыі немагчыма дабіцца поўнай перамогі над клясавымі ворагамі»? Гэта ўказаньне т. Сталіна павінен выконваць кожны калуковы працаўнік-марксыст. Нельга прымірыцца з тым, што частка ранукоўных прапаўнікоў камуністаў у галіне савецкага будаўніцтва і права не дадала належнага адпору ідэолёгам буржуазіі і не выкрывала рэакцыйнай сутнасьці і варожасьці для дыктатуры пралетарыяту іх тэорыі.

Ня можа быць прымірэньня да ворагаў наступаючага на ўсім фронце сацыялізму.

Парэчын у сваім апошнім выступленьні з студэнтамі на сходзе таварыства марксыстаў-дзяржаўнікаў абараняў далей свае пазыцыі. Ён, ня гледячы на выступленьні т. Сорбэцкі, Хацкевіча, Галандзы і інш. таварышоў в крытыкай яго памылак, упарта казыў, што ён «ніякага нацыянал-дэмакратызму у сваіх працах не прызнае».

Гэта нацьвярджае зробены вышэй вывад з першага выступленьня Парэчына, што рупары нацыянал-дэмакратызму не разбройваюцца.

Н. Янэль.

*) Гл. «Зьвязду» ад 29-га лістапада № 278 (3376) артыкул Янэля «Супроць нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі ў пытаньні дзяржавы».

*) Запіскі аддзелу Гуманітарных Навук, працы катэдры сучаснага права 1929 г. ст. 5.

У Капыльшчыне

акапаліся вялікадзяржаўныя шавіністы

Раённае кіраўніцтва—у баку ад барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку

Дырэктывы партыі і ўраду аб правядзеньні беларусізацыі ў Капыльскім раёне не ажыцьцяўляюцца. Месячнік беларусізацыі ў раёне сарваны. Створаная камісія пры РК КП(б)Б работы не разгарнула. Партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя, рабочыя і калгасныя масы не мабілізаваны на правядзеньне месячніка. Райком КП(б)Б тольки прыняў пастанову аб правядзеньні месячніка, але сваёй дырэктывы не правяраў.

Асабліва ганебна сарвана работа на прафсаюзнай лініі. Райпрафбюро і пасобныя райкомы саюзаў нават і да гэтага часу на сьпалі плянаў. Райвыканком толькі 28 сьнежня склаў кароткі плян месячніка, але нават і ў гэтым пляне — толькі агульныя разважаньні.

Па лініі раўінспэктарыяту асьветы нічога ня зроблена па месячніку. Калгасныя масы нават і ня ведаюць аб месячніку. Рабочыя сайтасаў таксама пытаньня аб месячніку не абгаворвалі.

Між тым, мы маем шмат выпадкаў праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму і шавінізмаў розных колераў. Выяўляюцца выпадкі грубага парушэньня нацыянальнай палітыкі партыі і ўраду ў пасобных сельсаветах і цэнтры раёну. У Капыльскім раёне, дзе шмат нацыянальнасьцяй, дзе ёсьць польскі нацыянальны сельсавет, мы бачым скрыў ленькае лініі партыі ў рабоце сярод меншасьцяй.

Работнікі Цімкаўскай спажывецкай кааперацыі вызначылі нарадзе выдачы розных тавараў не паводле клясавага прынцыпу, а паводле нацыянальнага. Вывешвалі на дзьвярах абвесткі: «Беларусы і іншыя нацыянальнасьці атрымліваюць тавары на суботах і нядзелях, а ў іншыя дні тавары атрымлівае выключна яўрэйская насельніцтва».

Да гэтага правакаючага нацыянальную розь «парадку» прыстасаваліся найшчыкі.

У самым Капылі пры справядзачы старшыні мясцовага савету т. Шыфрынай на сходзе парт'ячэйкі мы чулі: «У нас ленінская нацпалітыка поўнасьцю праводзіцца. Сярод яўрэйскага насельніцтва работа ў галіне нацыянальнай не праводзіцца таму, што яўрэйская беднота яшчэ ня ўся ўвайшла ў калгасы. Сярод татарскага насельніцтва асаблівай работы вёсьці ня трэба таму, што яно асыміляваліся».

Да такога «растлумачэньня» нацыянальнай палітыкі партыі трэба дадаць і тое, што сам старшыня мясцовага савету выказваўся толькі на расійскай мове.

Старшыню падтрымлівала некалькі паргшыцаў. Выступіў адзін каморнік Сагінар, які надаўна скончыў Горацкую с.-г. акадэмію:

«Калі я быў у сельска-гаспадарчай акадэміі, ад мяне патрабавалі гаварыць на беларускай мове. Гэта вусім ня правільна. Такое патрабаваньне трэба прад'явіць інспэктару асьветы. А ўсім іншым работнікам прад'яўляць гэта немагчыма. Інспэктар з гэтага есьць хлеб і таму павінен займацца вывучэньнем беларускай мовы».

Яго падтрымалі і іншыя члены ячэйкі і асабліва старшыня спажывецкага т-ва Хацілаў.

Хацілаў гаворыць: «Я ніколі па беларускай мове гаварыць ня буду і ніхто ад мяне ня можа гэтага патрабаваць. бо я ня вучыўся ў школе, бо мне не даюць часу вывучаць беларускую мову».

А член бюро райкому ЛКСМБ і загадчых масавым аддзелам Хаюцін, член партыі, скарджаўся на агульным сходзе, што яго ніправільна вылучылі на працу сярод яўрэйскага насельніцтва: «Я не магу працаваць сярод яўрэйскага насельніцтва, хаця сам і яўрэй, бо ведаю лепш расійскую мову».

Калі ўзяць партыйныя ячэйкі Капыльшчыны, дык вы знойдзеце вялікую колькасьць такіх партыйцаў, якія і да гэтага часу ня хочуць вывучаць беларускую мову. Нават адказныя работнікі, як Варламаў, Кузьняцоў, Кірсанаў, Кржасінскі, дагэтуль адмаўляюцца гаварыць па-беларуску.

Работнікі яўрэйскай школы — Гарлоўская, Лотвіна, Найман, Отарава — кажуць: «Што нам займацца такім глупствам, як вывучэньне беларускай мовы, калі з беларускім насельніцтвам мы можам гаварыць па-расійску. Нам трэба ведаць толькі яўрэйскую мову і ніхто нас за гэта ня можа абвінавачваць».

На ўсе гэтыя агідненькія факты раённыя кіраўнічыя органы не рэагавалі і да гэтага часу. Трэба моцна стукнуць па носьбітах вялікадзяржаўнага шавінізму і шавіністы усіх колераў. Трэба заняцца, каму гэта належыць, арганізацыйнымі выкладамі ва ўсёй рабоце па правядзеньні нацыянальнай палітыкі ў Капыльшчыне, у прыватнасьці ў правядзеньні месячніка беларусізацыі.

В. Н. Ж-каў.

Яшчэ апошні з магікан

Тыповы буржуазны ідэолёг і вялікадзяржаўны шавініст пад маскай „лёяльнасьці"

Ня гледзячы на тое, што мы вядзем бязьлітасную барацьбу з клясавым ворагам на розных франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і на навуковым фронце, ня гледзячы на тое, што толькі ў ВДУ на працягу 3-4 апошніх год звольнена звыш 20 прафэсароў за прапаганду буржуазных ідэй, ня гледячы на ўсё гэта яшчэ і да апошняга часу сустракаюцца сярод навуковых працаўнікоў актыўныя абаронцы буржуазных тэорый.

Яшчэ на акадэмічнай канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ў лістападзе 1926 г. праф. Замоцін зрабіў заяву, што сацыялёгічны мэтад не зьяўляецца выстарчальным для вывучэньня літаратурных твораў і што ён можа быць скарыстаны толькі пасьля фармальна-мастацкага аналізу. У такім-жа напрамку была прынята і рэзалюцыя. З такай рэзалюцыяй, між іншым, салідарызаваўся і праф. Вазьнясенскі, які выдаваў сябе за марксыста да самага апошняга часу. Сапраўды-ж праф. Вазьнясенскі, пад выглядам марксыста, падносіў нашым студэнтам у сваіх лекцыях і літаратурных творах ідэі рыкэртыянства. Паводле вучэньня Рыкэрта гістарычныя падзеі маюць індывідуальны непаўторны характар. Гэта значыць, што, напрыклад, Кастрычніцкая рэвалюцыя зьяўляецца такой гістарычнай падзеяй, якая ня можа паўтарыцца нават у сваіх агульных гістарычных рысах у другіх капіталістычных краінах. На аснове мэтадалёгіі Рыкэрта праф. Вазьнясенскі і будаваў свой курс па гісторыі літаратуры. Для таго, каб атрымаць магчымасьць прапагандаваць гэту буржуазную тэорыю ва ўмовах нашага строгага пралетарскага кантролю, паказаны прафэсар для адводу вачэй успамінаў у сваіх працах і пра марксыцкі мэтад. Але аналіз марксыцкага мэтаду ў яго зводзіўся толькі да простага «аб'ектыўнага» канстатаваньня аб тым, што гэты мэтад існуе побач з іншымі мэтадамі.

Ня гледзячы на антымарксыцкую ўстаноўку паказанага прафэсара, знаходзіліся такія «марксысты», якія падтрымлівалі яго погляды. Маскоўскія аўтарытэты—Лебедзеў і Перавярзеў давалі дадатныя рэцэнзіі на яго артыкулы і тым самым дапамагалі Вазьнясенскаму выдаваць свае буржуазныя погляды за марксізм.

У лісьце ад 15 верасня 1926 г. Лебедзеў пісаў на імя Вазьнясенскага: «Ваш артыкул «Праблема апісаньня і тлумачэньня ў навуцы аб літаратуры» і мне і Б. Ф. Перавярзеву падабаецца і мы яго зьмяшчаем у 2-м зборніку «Родной язык в школе». На пасяджэньні камісіі, якая была створана ў верасьні пры ВДУ для вывучэньня справы Вазьнясенскага, апошні ўпарта даказваў, што ён марксыст. А пасьля сканчэньня працы камісіі сам Вазьнясенскі на наступны-ж дзень падаў заяву такога зьместу:

«Аднэй з аскоўных маіх памылак у артыкулах тэаратычнага характару зьяўляецца тое, што я недаволі (?! вы-разна і рэзка адмежаваўся ад пункту погляду ў літаратуразнаўстве, варожых марксызму, таму мае працы насілі да гэтага часу эклектычны характар.

Потым да ліку асноўных памылак у маіх артыкулах адносіцца і тое, што я не падкрэсьліваў у іх са ўсёй рашучасьцю настойлівай і першачарговай неабходнасьці высьвятленьня ў мастацкай творчасьці ня клясавай сутнасьці і трактоўкі кожнага твору, як зброі клясавай барацьбы.

У сувязі з гэтым я ў сваіх творах па беларускай літаратуры ня выпрацаваў са ўсёй выразнасьцю і яснасьцю клясавай асновы вывучаемых пісьменьнікаў.

У сваіх працах на заможных мовах я прытрымліваўся ў корані памылковага, так званага аб'ектыўнага пункту погляду і, выкладаючы даныя аб напрамках у сучасным расійскім літаратуразнаўстве, по ашибэсьці з неабходнай крытычнасьцю да тых клясаў, якія зьяўляюцца варожымі марксызму (фармалізм, фройдызм і інш.), ня ўскрываў іх клясавай сутнасьці і не паказаў, што барацьба паміж гэтымі плынямі зьяўляецца адбіткам клясавай барацьбы, якая адбываецца ў СССР.

Я не завастраў сваёй увагі і свалчасова не адмежаваўся ад рэвалюцыі, якая была вынесена на акадэмічнай канфэрэнцыі ў 1926 г. на дакладах аб беларускай літаратуры, прачытаных там».

Такім чынам, праф. Вазьнясенскі прызнаў сваю варожую марксызму дзейнасьць, зьмякчаючы ня тым, быццам гэта былі толькі памылкі. Праф. Вазьнясенскі піша, што ён не даваў аналізу клясавай сутнасьці мастацкай літаратуры, прымірэнча адносіўся да варожых марксызму плыняй і «абэктыўна» інфармаваў буржуазных чытачоў у буржуазных часопісях аб нашай савецкай літаратуры. На запытаньне камісіі, чаму ён не аналізаваў клясавай сутнасьці беларускай літаратуры, Вазьнясенскі адказаў, што, быццам, ён баяўся, каб беларусы не абвінавачвалі яго ў вялікадзяржаўным шавінізьме. Уся гэта матывоўка дваўліцая і хлусьня. Няўжо Вазьнясенскі ня ведаў, што аналіз клясавай сутнасьці літаратуры зьяўляецца ў нас выключна важнай задачай кожнага аўтара і лектара, які хоча выкладаць з катэдры савецкіх ВНЗоў-тэтэаў? Сьвядома акручваць мазгі нашага студэнцтва розным эклектычным сьмецьцем на працягу некалькіх год, гэта значыць наўмысна праводзіць шкодніцкую работу ў мэтах зрыву падрыхтоўкі марксыцка-асьветных кадраў. Чаму Вазьнясенскі прызнаў свае «памылкі» толькі тады, калі камісія закончыла сваю работу і пастанавіла звольніць яго з унівэрсытэту? Няўжо ён ня мог выправіць свае так званыя памылкі раней, калі пытаньне аб ім яшчэ ня ставілася? Тады, мабыць, ён спадзяваўся, што яго шкодніцкая работа ня будзе выкрыта.

Прафэсар Вазьнясенскі прызнае памылку ў тым, што ён быццам бы «аб'ектыўна» інфармаваў зарубежных чытачоў праз заходнеяўрэйскі друк аб савецкай літаратуры. Сапраўды-ж паказаны прафэсар ня толькі «аб'ектыўна» інфармаваў, скажаючы тым самым прадстаўленьне аб нашай сапраўднасьці, але і прымаў удзел у такіх часопісях, супраціўнікамі якіх зьяўляюцца бела-эмігранты. У «Славянском обозрении» на англійскай мове быў зьмешчан артыкул Вазьнясенскага побач з артыкуламі Мілюкова, Керанскага і іншых заклятых ворагаў савецкай улады. Гэты ўчынак Вазьнясенскі апраўдвае тым, быццам ён ня ведаў палітычнага напрамку часопісі. Але-ж гэта хлусьня. У лісьце рэдакцыі на яго імя яусім выразна адзначалася, што часопіс «Славянское обозрение» друкуе «палітычныя артыкулы» і што пункт погляду рэдакцыі «не камуністычны». Ужо гэта адно павінна было прымусіць Вазьнясенскага, калі-б ён жадаў быць пасьлядоўным савецкім сучасным, адмовіцца ад прапановы рэдакцыі прыняць удзел у паказанай часопісі. Але Вазьнясенскі ня лічыў патробным гэтага зрабіць. А між іншым гэта часопісь выдаецца за мяжой пад пазунгам «адзінай непадзельнай Расіі». Прымаючы ўдзел у паказанай часопісі, Вазьнясенскі выкрыў сваю сапраўдную прыроду буржуазнага літаратуразнаўцы і вялікадзяржаўнага шавініста.

Вусім невыпадкова і тое, што гэты прафэсар, ня гледзячы на доўгае прабываньне ў Беларусі, вучыў і дагэтуль ня лічыць для сябе неабходным карыстацца беларускай мовай. Усе афіцыяльныя заявы ў камісію ён пісаў на расійскай мове. На гэтай-жа мове ён і праводзіў гутарку ў камісіі пры высьвятленьні яго справы. Вазьнясенскі піліна баяўся, каб яго не абвінавачвалі ў вялікадзяржаўным шавінізьме за клясавы аналіз беларускай літаратуры. Няўжо-ж ён сур'ёзна думае, што немга яго абвінавацьць у вялікадзяржаўным шавінізьме за супраціўленьне беларусізацыі? Праф. Вазьнясенскі—самы тыповы буржуазны ідэолёг і вялікадзяржаўны шавініст. Такім прафэсарам ня месца ў савецкіх вышэйшых навучальных установах.

П. ПАНКЕВІЧ.

Спыніць прапаганду нац.-дэмакратызму!

У той час, калі пралетарыят БССР пад кіраўніцтвам партыі вядзе рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам — агентурай польскага фашызму, па Борказіцкім раёне (б. Полаччына) разьяжджаюць кіно-перасоўкі Белкавасаюзу і дэманструюць кін-фільм «Кастусь Каліноўскі» (выдумны нац.-дэмакратамі «тэрой» чырвонага жонду ў паўстаньні 1863 г., якое па свёй сутнасьці зьяўлялася паўстаньнем польскай шляхты супроць расійскага царскага самаўладзтва).

Трэба спыніць дэманстрацыю гэтага шкодніага кіно-фільму, а кіраўніцтва Белкавасаюзу і Белдзяржкіно за прапаганду нац.-дэмакратызму прыцягнуць да адказнасьці.

М—ч.

Як аршанскі „гісторык" Васілеўскі

растлумачвае сутнасьць нацыянал-дэмакратызму

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, апраўчыся на рабочую клясу, атрымала вялізарную перамогу ў барацьбе за ленінскую лінію ў нацпалітыцы, супроць усякіх адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі. У бязьлітасной барацьбе супроць расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму — агентуры польскага фашызму і шавінізму іншых колераў, супроць нацыянал-апартуністаў — гэтых кулацкіх агентаў, нацыянал-дэмакратаў з партбілетам у кішэні» ўнутры нашай партыі — уся КП(б)Б, яшчэ больш паленінску загартавалася. Рабочая клясa ў саюзе з працоўным сялянствам яшчэ больш у гэтай барацьбе згуртавалася навакол партыі бальшавікоў.

Выкрыцьцё ДПУ Беларусі контр-рэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нац.-дэмакратаў на чале з Ластоўскім, Цьвікевічам, Некрашэвічам, Лёсікам і інш., рыхтаваўшай у саюзе з Рамэйнам і К° інтэрвэнцыю супроць СССР, выкінула хвалю клясавага абурэньня з боку рабочых, калгасьнікаў, працоўнага сялянства і працоўнай інтэлігэнцыі.

Апошні кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б нанёс руйнуючы ўдар на нацыянал-апартунізьме, абадзьніўшы несумяшчальнымі погляды нацыянал-апартуніэму з прыналежнасьцю да КП(б)Б, выкінуўшы тав. Ігнатоўскага за грубейшыя скрыўленьні ім партлініі за час яго работы ў ВАН са складу Бюро і ЦК КП(б)Б. Уся КП(б)Б спаткала гэту пастанову кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б з вялікім здавальненьнем, як адзіна правільную, ленінска-насьлядоўную бальшавіцкую пастанову.

Але аказалася, што аршанскі «гісторык», выкладчык эканомікуму, старшыня аршанскага краязнаўчага бюро, «камуніст» Васілеўскі з пастановай пленуму ЦК КП(б)Б на згодзе. Васілеўскі парашыў на агульным сходзе настаўніцтва давер'е бюро ячэйкі КП(б)Б працаўсьветы, якое яму даручыла зрабіць даклад аб клясавай сутнасьці нацыянал-дэмакратызму і аб нацыянал-апартуністычнай дзейнасьці т. Ігнатоўскага,—скарыстаць для барацьбы супроць генэральнай лініі партыі, супроць ленінская нацпалітыкі і для абароны «пакрыўджанага» т. Ігнатоўскага.

Васілеўскаму справы няма да таго, што ўся партыя ў адным радзе сваіх важнейшых пастаноў ахарактарызавала нацыянал-дэмакратызм, як ідэалёгію капіталістычнай рэстаўрацыі, што жыцьцё даказала, што нацыянал-дэмакраты ўсіх колераў зьяўляюцца простымі агентамі міжнароднага імпэрыялізму, лёкаямі вайны супроць СССР.

Васілеўскаму справы няма да таго, што ўся КП(б)Б кваліфікуе нацыянал-апартунізм, як кулацкую ідэалёгію, а нацыянал-апартуністаў, як агентаў клясавага ворага ўнутры партыі, як «нацдэмаў з партбілетам у кішэні», што на практыцы бясслаўнай дзейнасьці нацыянал-апартуністаў у БССР даказана, што нацыянал-апартунізм у эканоміцы змыкаўся з кулацкай, контр-рэвалюцыйнай палітыкай Прышчэпава ў НКЗ, што ў НКА, у Беларускай Акадэміі Навук і Наркамземе фактычна быў адзіны шкодніцкі фронт на выкананьні сацыяльнага заказу нацыянал-фашыстаў, агентаў польскага фашызму — Луцкевіча, Астроўскага і К°.

Васілеўскаму справы ня

2.698.000 га — ня менш!

РУЙНУЮЧЫ ЎДАР ПА КУЛАЦКІХ АГЕНТАХ У ПАРТЫІ—ПРАВЫХ АПАРТУНІСТАХ,—ЯКІЯ СКАРАЧАЮЦЬ ПЛЯНЫ ПАСЕЎНЫХ ПЛОШЧАЎ І СПРЫЯЮЦЬ ЗЬНІШЧЭНЬНЮ КОНСКАГА СКЛАДУ

Па-бальшавіцку біцца за кожны гэктар тэхнічных і кармавых культур, за захаваньне кожнага працаздольнага каня, за выкананьне дырэктыў партыі аб сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі

Мабілізаваць масы калгасьнікаў і адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на барацьбу з кулаком,

на АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЗАДАЧ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

10,5 проц. яравога кліну--у небясьпецы

У сваёй пастанове аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі ад 24 сьнежня 1930 г. **НКЗ СССР забараніў НКЗемам рэспублік і крайземкіраўніцтвам зьмяншаць разьмеры пасеўных заданьняў**, разьмеры страхавых і насенных фондаў і г. д. Ня гледзячы па гэта, **кантрольная лічба, прынятая НКЗ БССР, меншая на 33.000 гэкт. заданьня НКЗ СССР.**

Нашай брыгадзе ў **НКЗ наконт гэтага заявілі:** «калі мы атрымалі плян НКЗ СССР у 2.698.000 гэкт., наш плян у 2.665.000 гэкт. **(гэта лічба уключае таксама пасевы шматгадовых траў слубы 1929-30 г.)** ужо быў зацьверджан і пушчан у раёны і сельсаветы. Таму мы лічым нямэтазгодным парушаць данныя раёнам заданьні, але разьлічваем перавыкаваць свой плян і такім чынам, наадпоце, выканаць кантрольныя лічбы НКЗ СССР».

Але, незважна ад гэтых добрых памераў НКЗ БССР, **многія раёны пасвойму падышлі да складаньня пасеўных плянаў. Раёны ня толькі не пакрылі ў парадку сустрэчнага пляну розьніцу ў 33.000 гэкт.** паміж плянамі НКЗ БССР і СССР, але пачалі **ад успкімі ўловамі ўрэзваць і скарачаць пляны НКЗ БССР.**

З 100 раёнаў 74 высунулі скарочаныя, зьменшаныя «сустрэчныя» пляны. На асобных раёнах зьніжэньне пляну хістаецца ад 500 да 11.000 гэкт., а агульная лічба, якая выклікае супярэчнасьці паміж раёнамі, складае 250.000 гэкт., а разам з 33.000 гэкт. (розьніца ў плянах НКЗ СССР і БССР) **283.000 гэкт., г. зн. 10,5 проц. усяго яравога кліну.**

Характэрна адзначыць, што значная частка раёнаў, якая сустрала ў штыхі заданьні НКЗ БССР, **увосень мінулага году дабівалася зьніжэньня кантрольных лічбаў.** Напрыклад, **Горацкі раён**, атрымаўшы заданьне ў 12.500 гэкт., высунуў «сустрэчны» ў 8 тыс. гэкт. **Сакратар райкому партыі** тады заявіў: **«нехай зьнімаюць з працы, нехай даюць вымову, але пляну мы ўсё роўна не можам выканаць».** ЦК КП(б)Б вынес сакратару райкому суровую вымову. **Раён усё-ж засеяў 11.500 гэкт. Відаць, работнікі Горацкага раёну за гэты час нічому не навучыліся.** Яны зноў высунулі плян, у якім скромна **скінулі з ліку заданьня 11 тыс. гэкт., ці 33 проц. Гэта-ж самае адносіцца і да Церахаўскага, Тураўскага, Сьвятлявіцкага, Брагенскага, Хоніцкага раёнаў, якія скарацілі свае пляны на 20-30 проц.**

Але калі ўвосень толькі 19 раёнаў супярэчылі супороць пляну і дабіліся яго зьмяншэньня, дык зараз гэта зрабілася **масавым амаль раённым зьявішчам.**

Раёны зьмяншаюць заданьні па тэхнічных культурах, а НКЗ вельмі дрэнна паведамлен аб тым, што робіцца ў раёнах.

Пасеўны плян даведзен да 721 калгасу, што складае 17,5 проц., і да 55 проц. саўгасаў. **Значна адстае даведзеньне пляну да індывідуальнага сэктару**, дзе плян даведзен толькі да 17 тыс. гаспадарак, што складае **2,5 проц. Калі даведзеньне пляну будзе далей ісьці такім тэмпам, дык тэрміны НКЗ СССР будуць сарваны.**

Па зборы насенных фондаў у калгасах **плян выкананы на 40 проц.; па страхавых фондах — на 10,5 проц. КСТУ свае заданьні выканалі на 2,5 проц.** Значна горш са стварэньнем страхавога і насеннага фонду па індывідуальным сэктары і забесьпячэньнем броня - фонду ў калгасах.

На словах нам. НКЗ тав. Сьмірнова рамонт с.-г. машын і інвэнтару знаходзіцца ў агіднейшым становішчы. З намечаных плянам 14 майстэрань для рамонту складаных машын, пачалі працу толькі 7. Як майстэрні забясьпечаны кваліфікаванай рабочай сілай, інструментамі, якімі тэмпамі яны працуюць—ніхто пакуль што ня ведае. НКЗ і Трактарацэнтр не праверылі работу асноўных рамонтных майстэрань. Нядаўна на пекальні дзён спынілася работа слуцкай рамонтнай майстэрні, бо склад Бельсельснабу ў Менску быў зачынен для ўліку і спыніў адсылку запасных частак.

Пры саўгасах арганізавана 120 майстэрань па рамонце складаных машын, але ня гэтыя майстэрні працуюць — ніякіх вестак няма. У саўгасе **Косіна**, Лагойскага раёну, у трактарнай калёне 8 трактараў патрабуюць рамонту, **але ў саўгасе яшчэ нічога ня зроблена. Адзін вусенічны трактар гэтага саўгасу ўжо тры тыдні, як кінуты ў канаву** за некалькі вёрст ад саўгасу і адміністрацыя ня прымае ніякіх мер для таго, каб даставіць гэты трактар у саўгас.

***

Кепска ідзе падрыхтоўка кадраў трактарыстаў. Колькі фактычна арганізавана курсаў, як яны працуюць, нам не маглі расказаць. Трактарацэнтр, Белсельтрэст, Насентрэст і Калгасцэнтр маюць нейкія намячэньні па арганізацыі курсаў. Аднак, гэта работа ідзе такімі тэмпамі, якія не забясьпечваюць патрэбы ў трактарыстах і тым самым не забясьпечваюць максымальнага скарыстаньня трактарнага парку БССР. **Толькі Трактарацэнтру патрэбна будзе звыш 5 тыс.** старэйшых і малодшых трактарыстаў, паляводаў і мэханікаў. **Пакуль што,** як заявіў упаўнаважаны Трактарацэнтру, існуючымі **курсамі ахоплена 2.600 чал.**

Аддзел кадраў НКЗ па пытаньні падрыхтоўкі кадраў трактарыстаў сказаць нічога ня можа. Загадчык гэтага аддзелу тав. **Сушкевіч** **нават ня ведае**, ці разглядалася гэта пытаньне на калегіі НКЗ. Ён паказаў брыгадзе чарнавыя нататкі, у якіх сам ня мог разабрацца. Мімаволі паўстае пытаньне, **чым-жа займаецца сэктар кадраў НКЗ?**

Трэба адзначыць, што **ў радзе калгасаў і саўгасаў БССР існуе недавацэнка жывой цягавай сілы.** Спадзяючыся на атрыманьне трактараў, некаторыя калгасы ўжо распрадалі значную колькасьць коняй. **Калгасы Менскага прыгараднага раёну прадалі 125 коняй у той час, калі для правядзеньня веснавой сяўбы гэтым калгасам патрэбна каля 250 коняй. Па гэтым трэба безадкладна ўдарыць. Раёны павінны памятаць, што побач з максымальным скарыстаньнем трактараў і мэханічнай цягавай сілы, неабходна поўнасьцю скарыстаць жывую цягавую сілу, якая яшчэ займае і будзе займаць значнае месца ў правядзеньні пасеўнай кампаніі.**

***

Неабходна адзначыць, што НКЗ у адказ на «сустрэчныя» раёнаў запрапанаваў у катэгарычнай форме выканаць заданьні. **Але ўсё-ж факт, што частка раёнаў актыўна дабіваецца зьмяншэньня пляну. Гэта сьведчыць аб тым, што дзе-ні-дзе замест мабілізацыі мас пануюць апартуністычныя настроі і самацёк.**

Па гэтых фактах самых яркіх праяўленьняў правага апартунізму на практыцы трэба неадкладна накіраваць агонь. Усе раённыя партыйныя арганізацыі, усе члены партыі павінны, апіраючыся на калгасьнікаў, беднату і батрацтва, у саюзе з сераднякам, стаць на чале барацьбы за бальшавіцкі плян, за бальшавіцкі сустрэчны і забясьпечыць посьпех другой калгаснай вясны.

Ударная брыгада «Праўды» і «Зьвязды»: Стырна, Хэйфец, Ордотаў, Гайнзрыка.



ПРЫВЕЗЬЛІ МАШЫНЫ

Габінэтнае кіраўніцтва

Белсельтрэсту не забясьпечвае пасьпяховую падрыхтоўку саўгасаў

НЕКАТОРЫЯ САЎГАСЫ СКАРАЧАЮЦЬ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ

Яравы клін саўгасаў Белсельтрэсту па 1931 год вызначаны ў 44 тыс. гэкт. У параўнаньні з мінулым годам пасеўная плошча павялічваецца амаль на 50 проц.

Кантрольныя лічбы пасеўнай кампаніі ўжо даведзены да саўгасаў. Некаторыя саўгасы вельмі дрэнна прапрацавалі кантрольныя лічбы. **Саўгасы «Вязьма-Фаніпаль» і «Забалоцьце»**, замест высоўваньня сустрэчных плянаў, **зьменшылі кантрольныя лічбы пасеву на 20-25 процантаў, а саўгасы «Вяліца-Вядскі і «Фаніпаль» — на 50 проц.** Зьмяншэньне кантрольных лічбаў ідзе, галоўным чынам, у адносінах агародных культур.

Там, дзе да апрацоўкі кантрольных лічбаў падыходзілі сур'ёзна, дзе бралі пад увагу патрэбнасьць папырэньня плошчы засеву, ёсьць добрыя вынікі. **Саўгас «Зорка-Захады» павялічыў плошчу засеваў супроць кантрольных лічбаў на 30 гэкт.**

Белсельтрэст і саўгасы вельмі марудна рыхтуюцца да сяўбы. Многія саўгасы яшчэ дагэтуль ня прыслалі вестак аб с.-г. машынах, якія патрабуюць рамонту. Конскай цягавай сілай амаль усе саўгасы забясьпечаны. Не хапае прычаплога інвэнтару да трактараў. 76 трактараў патрабуюць рамонту, да 24 трактараў «Інтэрнацыянал» і «Камунар» не хапае запасных частак. У саўгасы павінна быць дастаўлена 800 новых трактараў, але пакуль што не атрыманы ні адзін. З с.-г. машын не хапае 190 плугоў, калі 500 барон, 100 сявалак, 300 трактарных плугоў і т. д.

З двух рамонтных майстэрань Белсельтрэсту працуе толькі адна; другая майстэрня, ня гледзячы на наўпасьць абсталяваньня, на можа быць адкрыта толькі таму, што Белкалгасбуд ня скончыў пабудову памяшканьня для яе.

Дрэнна абстаіць справа з забясьпячэньнем саўгасаў угнаеньнем і насеньнем. Не хапае больш паловы патрэбнай колькасьці суперфасфату, гамашлакам саўгасы забясьпечаны на 25 проц. Для засеву усёй плошчы не хапае ікі 490 тон, плошкі — 26 тон, сэрадэлы—164 тоны.

Са свайго боку Белсельтрэст нічога не **зрабіў, каб перадаць у іншыя саўгасы** пішкі аўса, ячменю і пшаніцы. Наркамзем чамусьці дагэтуль не дае парадаў для разьмеркаваньня гэтых пішкаў.

З патрэбных 28 тыс. грубых кармоў саўгасы атрымалі парады толькі на 13 тысяч тон, а па канцэнтраваных кармох —замест 1.750 тон—650 тон.

Саўгасы адчуваюць недахват у рабочай сіле—**не хапае 4.500 чалавек. Белсельтрэст пакуль што абмежаваўся толькі дачай заяўкі ў Наркампрацы і нічога не зрабіў, каб самастойна распачаць вярбоўку рабсілы.** Наогул, Белсельтрэст праяўляе слабую зацікаўленасьць да пытаньня забясьпячэньня саўгасаў рабсілай.

Кіраўніцтва Белсельтрэсту і кантроль над работай саўгасаў зусім неадэкватныя. Белсельтрэст ня выканаў дырэктывы ўраду аб вызначэньні адказнага работніка, які-б персанальна адказваў за падрыхтоўчую работу да веснавой пасеўнай кампаніі. Трэст ня ведае, як праходзіць укамплектаваньне стада ў жывёлагадоўчых саўгасах.

У саўгасах «Тарасава», «Косіна» і інш. не праведзена ацэпленьне абор, зімоўка жывёлы ў саўгасах поўнасьцю не забясьпечана. Белсельтрэст у гэтым напрамку нічога не зрабіў, ён своечасова не праверыў, як саўгасы падрыхтавалі зімоўку жывёлы.

Уся работа трэсту праходзіць габінэтным шляхам. Белсельтрэст адарваны ад шырокіх колаў саўгасьнікаў, ён нават ня ведаз, ці ёсьць у рабоце саўгасаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ня было прынята ніякіх мер у адносінах саўгасаў «Фаніпаль» і «Апошаль», якія дагэтуль ня скончылі малацьбы яравых, а таксама не ачысьцілі насеньня.

Наглядаюцца і такія ненармальныя зьявішчы: саўгасы «Косіна» і «Тарасава» павялічылі свае заяўкі па кармы супроць запраўдных патрэбнасьці ў два разы. Саўгас «Забалоцьце» падаў заяўку на поўны камплект саней у той час, як можна было-б адрэмантаваць і выкарыстаць сані, якія ёсьць у саўгасе.

Выкананьне дырэктыў адносна дапамогі бліжэйшым калгасам і адзінаасобным бяднякам гаспадаркам не правяралася.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што **Белсельтрэст дагэтуль не павярнуўся яшчэ тварам да саўгасаў.** Белсельтрэст павінен пераключыць усю падрыхтоўчую работу да веснавой пасеўнай кампаніі на баявыя бальшавіцкія тэмпы.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды»: ПАГАЖЭЛЬСКІ, ВАЗІРУБ, БЯЗЗУБЕНКА, ШРУБОК, ПЕЧНІКАЎ, ЗАРУБЕЖНЫ.

6 ГЭКТ.—НАРМАЛЬНАЯ НАГРУЗКА,

а ў радзе раёнаў прыходзіцца 10 гэкт.

БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ ПА ІГНАРАВАНЬНІ КАНЯ.

Разбазарваньне і забой працаздольных коняй зьяўляюцца простай дапамогай кулаку, які ўсімі мерамі прабуе сарваць другую бальшавіцкую веснавую пасеўную кампанію. Трэба зацярэсьці увагу калгаснай грамадзкасьці на барацьбе з такімі шкодніцкімі зьявішчамі, на пытаньнях забесьпячэньня цягавай сілай, дагляду коняй.

Паводле вестак райкалгассакозаў на 45 раёнах становішча з цягавай сілай характарызуецца наступным чынам: па 5 раёнах **на аднаго каня** прыходзіцца **нагрузка звыш 10 гэкт.** пахаці, па 17 раёнах — **ад 6 да 10 гэкт.**, па 16 раёнах — **ад 6 да 8 гэкт.** і па 7 раёнах нагрузка ніжэй 6 гэкт. пахаці. Самую высокую нагрузку дае **Ветрынскі раён — 13 гэкт.** пахаці на аднаго каня, а самую нізкую — Брагінскі раён — 4,2 гэкт. на аднаго каня.

Такім чынам, **па большасьці раёнаў БССР становішча з забесьпячэньнем работ другой калгаснай вясны цягавай сілай далёка ніспрыяючае.** Зразумела, што пры такіх умовах некаторыя раёны ня змогуць выканаць дырэктывы партыі і ўраду аб папырэньні пасеўнай плошчы на 20 проц., калі тэрмінова ня будуць прыняты энэргічныя меры па захаваньні наяўнага конскага складу, перакідкі коняй і г. д.

На ўсіх работнікаў калгаснага руху ўскладаецца вялікая адказнасьць — **змагацца ўсімі мерамі супроць злачынных адносін да каня.**

Пастанова Белкалгасцэнтру прапануе ўсім райкалгассакозам **прыцягваць да судовай адказнасьці асоб, якія дапускаюць і спрыяюць разбазарэньню коняй.** Райкалгассакозы абавязваюцца тэрмінова праверыць забясьпечанасьць калгасаў конскай цягавай сілай, лічачы нагрузку на аднаго каня 5-6 гэкт. ворнай плошчы (у залежнасьці ад інтэнсыўнасьці гаспадаркі ў раёне), з абавязковым улікам павышэньня пасеўнай плошчы на 1931 год ня менш, чым на 20 проц. (10 проц. за рахунак папару і 10 проц. — за рахунак асваеньня новых зямель).

Белкалгасцэнтр папярэдзіў райкалгассакозы і калгасы, што наяўнасьць трактарнай цягавай сілы не павінна пацягнуць за сабой скарачэньне конскай цягавай сілы ў калгасным сэктары раёну, а наадварот, павінна быць выкарыстана для інтэнсыфікацыі гаспадаркі шляхам павялічэньня працаёмкіх культур, якія патрабуюць шмат цягавай сілы.

Трэба ўлічыць, што ў 1930 годзе ўдзельная вага трактарнай цягі была роўна 6 проц. У 1931 годзе, пры выкананьні пляну завозу трактараў, гэты процант у адносінах да агульнага балянсу цягавай сілы ў калгасным сэктары павялічыцца да 18.

Трэба мабілізаваць увагу шырокіх калгасных мас вакол пытаньняў правільнага кармленьня і догляду коняй.

Трэба безадкладна забясьпечыць усю жывёлу і ў першую чаргу каня кармамі ў напружаны перыяд веснавых палявых работ, безадкладна прыступіўшы да стварэньня непарушных кармавых фондаў.

Толькі ў паасобных выпадках гэта пытаньне вырашана і практычна праведзена, але зноў такі не да канца: фонд вылучаны, а варта не пастаўлена, а калі і пастаўлена, дык яна не правярэцца. Насенныя, кармавыя фонды ў калгасах павінны ахоўвацца першымі вартаўнікамі ўдзень і ўночы. Трэба памятаць, што кулак ня дрэмле.

Аграном Белкалгасцэнтру.
В. КРУГЛОЎ.

Спыніць зьдзекі з рабочага-„25-цітысячніка"

Дырэктар «Белдрэс'у» тав. **Фэльдман** замест таго, каб дапамагчы рабочаму-«25-тысячніку» пагаршае ўмовы яго работы. Вось адносіна, якую атрымаў «25-тысячнік» т. Візік ад камэнданта «Белдрэс».

«Тав. ВІЗІКУ. Згодна ўласнага распараджэньня дырэктара «Белдрэс'у» тав. Фэльдмана, вы ў двухтыдневы тэрмін павінны ослабаніць кватэру, якую займае ваша сям'я ў пасёлку Арэхі. Калі вамі ў двухтыдневы тэрмін з дня атрыманьня гэтай службовай запіскі ня будзе вашай сям'ёй ослабанена кватэра, дык ваша сям'я будзе ў прымушаным парадку выселена, бо кватэры патрэбны для рабочых, якія пакінуты на эксплёатацыі, а вы знаходзіцеся на пастаянным рабоце ў м. Дуброўна. Камэндант «Белдрэс'у» АЗЬЛІН».

Мы лічым такія адносіны да рабочага «25-тысячніка» недапушчальнымі. Адпаведныя органы павінны зацікавіцца гэтай справай.

25.000 коняй не хапае

для патрэб пасеўнай кампаніі сацыялістычнаму сэктару

Учора ў Наркамземе адбылася нарада стапай камісіі па рэгуляваньні конскага рынку.

Да гэтага часу ў БССР НЯ БЫЛО АДЗІНАГА ЗАГАТОЎЦЫ, ЯКІ-Б ВЁЎ ЗАГАТОЎКУ КОНЯЙ. Загатоўкі вяліся некалькімі арганізацыямі адначасова, што выклікала АЖЫЯТАЖ і блытаніну на конскім рынку.

На нарадзе высьветлілася, што, ня гледзячы на завоз трактараў, па рэспубліцы адчуваецца недахоп у конскай цягавай сіле. ДА ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ Ў АДНЫХ ТОЛЬКІ КАЛГАСАХ НЯ ХОПІЦЬ ПРЫБЛІЗНА 20 ТЫС. КОНЯЙ, А ПА САЎГАСАХ—5 ТЫС. КОНЯЙ. АСАБЛІВЫ НЕДАХВАТ КОНЯЙ АДЧУВАЕЦЦА Ў МАЗЫРШЧЫНЕ, ДЗЕ ЗАРАЗ ПРАВОДЗІЦЦА АБМЕН ВАЛОЎ НА КОНЯЙ.

НАРАДА ПАСТАНАВІЛА ЎСЮ ЗАГАТОЎКУ КОНЯЙ ПЕРАДАЦЬ ВЫКЛЮЧНА ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ КААПЭРАЦЫІ. Усе загатоўкі павінны быць праведзены на працягу першага квартылу 1931 году, з тым, каб да веснавой сяўбы калгасы былі забясьпечаны патрэбнымі коньмі.

Вялікая ўвага зьвернута камісіяй на захаваньне мандыкну.

М.

Упарта ня хочуць

выканаць важнейшых дырэктыў партыі

Першапачатковыя арыентыровачныя пасеўныя пляны Белкалгасцэнтру былі накіраваны ў раёны для абгаварэньня яшчэ ў лістападзе месяцы.

Адразу-ж ад раёнаў пачалі паступаць сустрэчныя пляны райкалгассакозаў, прычым, амаль усе раёны ў сваіх плянах значна скарачалі плошчу засеваў тэхнічных культур бульбы, караньплоду, а па некаторых раёнах нават пляны засеву траў. **Раёны пайшлі па лініі найменшага супраціўленьня, скарачаючы засеў больш працаёмкіх культур.**

Вось рад прыкладаў.

Бярэзінскі раён, замест заданьня аб давядзеньні пасеваў збожжавых культур да 2.547 гэкт., павялічвае яе да 4.300 гэкт. Затое **памяншаецца плошча пад засевы тэхнічных культур: замест 660 гэкт. — 500 гэкт.; бульбы—замест 2.040 гэкт.—1.600 гэкт.; траў — замест 700 гэкт.—500 і лубіну — замест 1.040 гэкт. —толькі 500.**

Пасеў тэхнічных культур, на думцы райкалгассакозу, ня можа быць павялічаны таму, што зямля, нібы, непрыгодна пад тэхнічныя культуры (!?). Гэта тлумачэньне, між тым, ня мае пад сабой ніякіх падстаў.

Лубіну, па думцы райкалгассакозу, нельга сеяць таму, што... уборка яго супадае з уборкай бульбы і гэта... пагражае ўборцы бульбы!?

Копыскі раён, замест павялічэньня плошчы пасеваў тэхнічных культур на 20 проц., лічыць магчымым павялічыць **толькі на 5 проц.**

Тлумачэньні райкалгассакозу такія: «Калгасы не забясьпечаны інвэнтаром, рабочай сілай, мінэральнымі ўгнаеньнямі». І вось, замест таго, каб дабіцца атрыманьня патрэбнага інвэнтару і ўгнаеньня, райкалгассакоз лічыць больш лёгкім скарачаць пляны пасеваў тэхнічных культур.

Скарочаныя пляны Копыскім райкалгассакозам былі спышчаны ў калгасы. Калі прыехаў прадстаўнік Белкалгасцэнтру, каб дабіцца прыняцьця вызначаных плянаў, **праўленьне райкалгассакозу адстойвала «немагчымасьць» павялічэньня пасеваў тэхнічных культур і лубіну. У той час склікана нарада старшынь калгасаў безагаворачна прыняла плян Белкалгасцэнтру.**

Чавускі раён у тлумачэньні да свайго скарочанага пляну піша, што **контрольныя лічбы, вызначаныя Белкалгасцэнтрам, на... адпавядаюць інтарэсам раёну**, што раён, нібы, зьяўляецца жывёлагадоўчым па сваім напрамку, а ні ільнаводным. Тут-жа райкалгассакоз прэчыць свайму тлумачэньню, скарачаючы плошчу засева... караньплоду.

Белкалгасцэнтр накіраваў у раёны рад работнікаў, якія на мясцох дабіліся прыняцьця папыраных плянаў. Усё-ж **некаторыя раёны упарта не згадзіліся і накіравалі ў калгасы зьменшаныя пляны. (Валынцы, Горкі, Расна, Гомель і інш.).**

Супроць такіх фактаў упартага нежаданьня выконваць дырэктывы партыі, супроць такой махравой правааапартуністычнай практыкі трэба ўдарыць з усёй рашучасьцю.

А.

Дача папяровых дырэктыў

не гарантуе іх выкананьня

НАЛАДЗІЦЬ ПРАВЕРКУ ЗЬВЕРХУ ДА НІЗУ

Брыгада азнаёміхася ў Белкалгасцэнтры з вытворчымі плянамі пасеўнай кампаніі калгасаў БССР і ходам падрыхтоўкі да веснавой сяўбы на мясцох.

Яравы клін на калгасах БССР вызначан у 1931 годзе ў 865 тыс. гэкт. — папырэньне на 20 проц. супроць мінулага году. Папырэньцо пасеўнай плошчы ідзе за лік ворыва лясных плошчаў, скарачэньня папару, зьніжэньня межаў і г. д.

У пляне блугчага году ў адрозьненне ад мінулых гадоў, прадугледжана значнае папырэньне і разьвіцьцё тэхнічных культур (лён, канопля), сіласных культур, арганізацыя гароднічтва. Плянам намячаецца павышэньне ўраджайнасьці збожжавых культур ня менш, як на 10 проц., тэхнічных культур — на 15 проц. і бульбы — на 10 проц. У сувязі са спэцыялізацыяй раёнаў, кантрольныя лічбы раёнам вызначаліся на культурах у адпаведнасьці з іх спэцыялізацыяй.

Кантрольныя лічбы даведзены да кожнага раёну. **У радзе раёнаў прапрацоўка кантрольных лічбаў, асабліва па тэхкультурах, сустракае процідзейнасьць з боку некаторых раённых арганізацый.** Некаторыя мясцовыя арганізацыі бяз санкцыі Наркамзему і Калгасцэнтру самастойна зьмяняюць кантрольныя лічбы ў бок зьмяншэньня тэхнічных культур, караньплоду. Сьміляўіцкі РВК пры разгляде кантрольных лічбаў Наркамзему і Калгасцэнтру скасаваў гэтыя кантрольныя лічбы. РВК зьменшыў лічбы Калгасцэнтру па засеве ў калгасах бульбы з 2.058 гэкт. да 1.000 гэкт., па ільне — з 269 гэкт. да 105 гэкт. Замест паказаных культур райвыканком павялічыў лічбу па другарадных культурах, матывуючы тым, што нібы калгасы ня змогуць выканаць заданьня Калгасцэнтру. Райкалгассакоз не палічыў нават патрэбным паведаміць аб гэтым Калгасцэнтр і **пачаў даводзіць да кожнага калгасу плян, вызначаны райвыканкомам.**

Прыгарадныя менскія калгасы, замест вызначаных ім 1.000 гэкт. гародаў, **самастойна зьменшылі гэту праграму да 500 гэкт.**, матывуючы гэта таксама тым, што «ня хопіць сіл для ўборкі». Такіх фактаў шмат, што ставіць над пагрозу выкананьне кантрольных лічбаў Наркамзему і Калгасцэнтру.

Складаньне вытворчых плянаў у калгасах пакуль што яшчэ не распачата. У Плешчаніцкім, Ветрынскім і радзе іншых раёнаў з-за адсутнасьці спэцыялістаў складаньне вытворчых плянаў знаходзіцца пад пагрозай. Рад кіраўнікоў калгасаў недаацэньваюць важнасьці складаньня вытворчых плянаў. **Старшыня калгасу «Беларуская вёска», Лёзьненскага раёну — Кузьняцоў** лічыць **непатрэбным складаньне плянаў і існаваньне вытворчых нарад: «Дзеля чаго яны, усё роўна калгасьнікі нічога не разумеюць».**

Калгасцэнтрам для аказаньня канкрэтнай дапамогі мясцом па складаньні плянаў камандыравана ў раёны 25 адказных работнікаў. У бліжэйшыя дні ў калгасы накіроўваецца 100 студэнтаў апошняга курсу Беларускай с.-г. акадэміі. Калгасцэнтр паставіў перад калгасамі задачу — скончыць складаньне вытворчых плянаў не пазьней 10 лютага.

У сувязі з папырэньнем яравога кліну і плошчы тэхнічных культур вялізарнейшую ролю адыгрывае свячасовая ссынка насеньня. Кантрольнымі лічбамі прадугледжана ачыстка ўсяго насеньня яравых культур, што складае каля 63 тыс. тон. Намечан засеў гатунковым насеньнем плошчы збожжавых культур у 158 тыс. гэкт.

Дырэктыва Калгасцэнтру аб ссыпцы насеньня выконваецца дрэнна, асабліва **па гародных і тэхнічных культурах. Заданьне выканана толькі на 25 проц.**

Рамонт машын і інвэнтару да пасеўнай кампаніі праходзіць марудна. Акрамя існуючых 815 майстэрань сёлета павінна быць арганізавана яшчэ 213. Аднак, дагэтуль **ў радзе калгасаў майстэрні яшчэ не адкрыты. У калгасах імя Дзяржынскага, «Камінтэрн», Сьміляўіцкага раёну, кузьні закрыты, а кавалі выкарыстоўваюцца для... догляду жывёлы.**

Як з кармамі? Да гэтага часу **ні ў адным калгасе не прыступілі да складаньня непарушных фуражных фондаў. У паасобных калгасах карны разбазараюцца.** Райкалгассакозы не аддаюць увагі пытаньню аб перакідцы кармоў з тых калгасаў, дзе ёсьць лішкі, у калгасы, дзе не хапае кармоў. За безгаспадарчае выдаткаваньне кармоў праўленьні двух калгасаў Плешчаніцкага раёну распушчаны і кіраўнікі калгасаў адданы пад суд. У Аршанскім раёне за гэта распушчана праўленьне калгасу «Юны тварэц». У радзе калгасаў ёсьць значная колькасьць неабмалочанага збожжа. Абмалот праходзіць вельмі марудным тэмпам.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якое было разгорнута ў калгасах у часе ўборчанай кампаніі, цяпер не адчуваецца. Рэдка які калгас мабілізаваў сабе на сапраўды бальшавіцкае правядзеньне пасеўнай кампаніі.

У радзе раёнаў частка калгасаў уражаю яшчэ не разьмеркавала. У Сьміляўіцкім раёне з 33 калгасаў толькі 11 правялі разьмеркаваньне ўраджаю. Там, дзе работа на разьмеркаваньні ўраджаю была пастаўлена добра, там назіраецца прыліў у калгасы і арганізацыя новых калгасаў. Асабліва вялікі прыліў дае сьнежань 1930 году. У лістападзе ў калгасы БССР улілося 4 тыс. бяднацка-сераднцкіх гаспадарак. За сьнежань арганізавана 451 новы калгас. **У новыя і існуючыя калгасы за апошнія месяцы ўлілося 11 тыс. гаспадарак.** На 1 студзеня 1931 году на БССР налічваецца 4.092 калгасы, якія аб'ядноўваюць 115.514 бяднацка-сераднцкіх гаспадарак.

У радзе раёнаў мясцовыя арганізацыі праяўляюць апартуністычную недаацэнку вытворчага каапэраваньня. Процант гаспадарак, ахопленых вытворчым каапэраваньнем, вельмі нізкі. У гэтай галіне асабліва адстаюць Асьвейскі, Хоцімскі і некаторыя іншыя раёны. У Асьвейскім раёне вытворчым каапэраваньнем ахоплен усяго 1 проц. бяднацка-сераднцкіх гаспадарак. У Хоцімскім раёне наогул не займаюцца пытаньнем вытворчага каапэраваньня.

Брыгада прыняла ўдзел у насяджэньні праўленьня Калгасцэнтру, на якім быў заслуханы даклад ударнай брыгады калгасьнікаў Самахвалавіцкага раёну, якая выяжджала ў Глускі раён для ўзяцьця на буксір калгасу «Рэвалюцыйны выбух». Першы ў Беларусі вопыт узяцьця перадавымі калгасамі на буксір адстаючых даў добрыя вынікі. Буксір даў магчымасьць калгасу «Рэвалюцыйны выбух» ачысьціць свае рады ад кулакоў — сыноў попаў і іншага варожага элемэнту і ў значнай ступені яго аздаравіць.

Брыгада «ПРАВДЫ», «ЗЬВЯЗДЫ»: Фелько, Быхавец, Балашцоў, Гайдукевіч, Казімірскі.



АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ

Драпежніцкі забой рабочай жывёлы

За апошні час у радзе раёнаў БССР узмацніўся драпежніцкі забой рабочай жывёлы. Побач з старымі коньмі, якія ніводны для палявой работы, у вёсках часамі б'юць маладняк.

Драпежніцкі забой жывёлы выклікан шалёнай кулацкай агітацыяй, якая накіравана да таго, каб да пачатку палявых работ зьнішчыць значную колькасьць цягавай сілы і сарваць пасьнікоў ход веснавой кампаніі.

Карэспандэнцыі з месц сьведчаць, што барацьба з драпежніцкім забоем у большасьці раёнаў відзецца вельмі слаба.

— Барацьба са зьнішчэньнем жывёлы ў Самахвалавіцкім раёне, — піша селькор Ведаючы, — амаль не відзецца. У вёсцы Цяпленъ і наогул у Цяпленьскім сельсавеце кулакі і падкулачнікі рэжуць жывёлу. Сельсавет на вачох якога ўсё гэта робіцца, ня прымае ніякіх мер.

— У Вягомльскім раёне, — піша селькор тав. Алёсь, — за апошні час мае месца забой жывёлы, асабліва маладняка. Мясцовыя адміністрацыйныя органы не зварачаюць ніякай увагі на драпежніцкі забой жывёлы.

Аб такіх-жа фактах пішуць і з іншых раёнаў.

Драпежніцкі забой жывёлы павінен быць зараз-жа спынен. Кулацкая агітацыя зроба даць самы рашучы адпор.

ДА III СЭСІІ ЦВК СССР

ВЫСТУПЛЕНЬНІ
ПРАДСТАЎНІКОЎ БССР НА СЭСІІ

Прамова тав. А. І. Хацкевіча

Мы заслухалі даклады грандыёзнейшых плянаў будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Калі мы паглядзім пляны і бюджэт, якія нам былі даложаны, то ўбачым, што ў гэтых плянах і бюджэце правільна вырашаецца пытаньне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў чым сэнсе, што і па пляне і на бюджэце прадугледжана падцягваньне ў сэнсе эканамічным, у сэнсе культурным ад сталых народаў да агульнага ўзроўню народаў Савецкага Саюзу. Рост лічбаў, рост бюджэту па акраінных рэспубліках значна вышэй агульнага сярэдняга росту па Савецкім Саюзе. Мне мысліцца, нам неабходна больш востра паставіць пытаньне, чым мы ставілі да гэтага часу, аб барацьбе са шкодніцтва, аб барацьбе з контр-рэвалюцыйнымі правямі пры выкананьні нашых вялізарнейшых плянаў.

Мы паставілі перад сабой задачу ў бліжайшы гістарычны перыяд дагнаць і перагнаць у сэнсе эканамічным і тэхнічным перадавыя капіталістычныя краіны. Мы гэту задачу выканаем.

У справе выкананьня плянаў, выкананьня бюджэту, выкананьня ўсіх мерапрыемстваў нашага сацыялістычнага будаўніцтва тав. Молатаў высунуў, як важнейшую задачу — плянаваньне і выкананьне. Мы ведаем, што пры агульным дастатку прадуктаў і харчоў нашы некаторыя органы так заплянавалі, што мы мелі і маем сур'ёзнейшыя перабоі ў справе забесьпячэньня працоўных мас наогул і перш за ўсё прадуктамі харчаваньня. З разьмеркаваньнем прадуктаў па фабрычна-заводзкіх прадпрыёмствах таксама ня зусім добра. Вось чаму на справу плянаваньня трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу ў рабоце на мясцох і ў цэнтры.

Мы ведаем усе, што сельсаветы да гэтага часу былі даволі актыўны ў справе кіраўніцтва будаўніцтвам калгасных гаспадарак. Разам з тым неабходна адзначыць і той факт, што слабавата вызначалася і выяўлялася адказнасьць сельсаветаў за правядзеньне калектывізацыі.

Далёка яшчэ ня ўсё зроблена з боку фінансавых органаў, каб сапраўды сельскі бюджэт стаў матар'яльнай базай усёй іх работы, каб сапраўды сельскі бюджэт быў самастойным сродкам сельскага савету для палянішэньня ўсёй яго арганізацыйна-масавай, гаспадарчай і культурнай работы. Пасьля ліквідацыі акруг выявілася, што паміж цэнтральнымі органамі саюзных рэспублік і аўтаномных абласьцей, з аднаго боку, і раёнаў — з другога, цэлая бездань. Выявілася адсутнасьць нармальнай сувязі.

Некалькі слоў наконт пазык. Мы акружаны ворагамі — капіталістычнымі дзяржавамі і яны, у лепшым выпадку, будуць цярпіма да нас адносіцца, выконваць заказы, выконваць гандлёвыя дагавары, а ў горшым выпадку будуць шкодзіць і рыхтаваць і ўжо рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу. Вось чаму нам на справу ўпутраных пазык трэба зьвярнуць выключна сур'ёзнейшую ўвагу. Усё, што можна ўзяць шляхам пазык ад працоўных мас, мы павінны ўзяць на справу будаўніцтва сацыялізму, але гэту справу трэба арганізаўшна лепш паставіць.

Справа абслугоўваньня ўкладчыкаў у ашчадкасах пастаўлена зусім дрэнна. Фінансавым органам неабходна ўжыць меры да таго, каб ашчадная справа, як крыніца сьцягваньня зьберажэньняў рабочых, служачых і працоўных мас, была арганізавана лепш, чым да гэтага часу.

Прамова тав. Каркліна

Таварышы, той грандыёзны народна-гаспадарчы плян, які складзен СНК на 1931 год і прадстаўлен на наша зацьвярджэньне, адказвае генэральнай лініі нашай партыі па народнай гаспадарцы і нашым сацыялістычным будаўніцтве, а таксама адказвае запатрабаваньням рабочае клясы, якія ажыцьцяўляе наша партыя ў сваіх штодзённых дзеяньнях. Гэты плян патрабуе ад нас бальшавіцкіх тэмпаў, другімі словамі, патрабуе выразнасьці, яснасьці, выканаўчасьці, адказнасьці і сапраўднага ўвядзеньня адзінапачальня зьверху да нізу і зьнізу да верху на простых гаспадарчых задачах і асобных даручэньнях, з якіх і складаецца гэты грандыёзны гаспадарчы плян.

Першае пытаньне, на якім я спынюся, зьвязана з нашым лесам. Вы ведаеце, што лес зьяўляецца значнай крыніцай даходу ў народна-гаспадарчым плане і, акрамя таго, дае неабходны будаўнічы матар'ял і задавальне ў пэўным разьмеры плян апалу.

Калі мы падыходзім да гэтага пытаньня, дык мы бачым, што тут маем шмат нявыкарыстаных магчымасьцяй, бачым шмат недахопаў, якія павінны быць зьнішчаны.

У тэл-жа камісіі па прамысловасьці мы чулі, што і Беларусь, якая перажывае востры крызіс у драўніне, знаходзячыся ў абкружэньні лясоў, ставіць пытаньне аб павялічэньні балянсу апалу за рахунак тарфяных распрацовак. Правільна, што для ўзмацненьня балянсу апалу мы павінны адначасова разгортваць і тарфянуп, і вугальную і іншую прамысловасьць апалу, але гэта не азначае, што мы не павінны займацца пытаньнямі лесу, і асабліва тэй часткі, якая застаецца нявыкарыстанай. Тут ёсьць шмат магчымасьцяй, якіх мы не скарыстоўваем. Па вопыце работы ў Беларусі, я павінен сказаць, што нам неабходна прадумаць пытаньне аб тым, каб лянёй рацыяналізаваць нашу работу ў палескіх, вятлускіх, паўночных і інш. лясох, каб у лесе не заставаліся дрэвы для гніеньня. У гэтых адносінах трэба прыняць рад дадатковых мер, якія да гэтага часу ня прымаліся.

Тут трэба адзначыць яшчэ і іншае і задаць сабе пытаньне — чаму псуецца лес і чаму гармозіцца шпаркасьць культываваньня нашых лясоў? Справа ў тым, што Леспром, пад ведама якога перадана ўся лясная гаспадарка і лесаводзтва, ня імкнецца культываваць лес, адпускае на гэта вельмі абмежаваныя сродкі. У гэтым годзе адпушчаны сродкі ў разьмеры мінулага году. Хаця мы з імі сгадзіліся, лічачы, што шляхам рацыяналізацыі і цэлага раду іншых мерапрыемстваў магчыма будзе атрымаць больш эфэкт за тыя-ж сродкі, але ўсё-ж такі на гэту тэндэнцыю Леспрома трэба зьвярнуць увагу, каб ня была падарвана сырцовая база тэйжа лясной прамысловасьці.

Другое цытальне, на якім я хацеў спыніцца, гэта пытаньне мабілізацыі сродкаў. Тав. Вятошкін, тав. Грынько і іншыя дакладчыкі ўжо гаварылі аб гэтым пытаньні і я цалкам далучаюся да іх установак.

Трэцяе пытаньне — гэта наконт ажыцьцяўленьня некаторых праграмных заданьняў па грашовым звароце, якія стаяць перад намі. У апошні час мы ажыцьцяўляем значны пераход на безнаяўныя разьлікі. Крэдытная рэформа па аграмаджаным сэктары, г. зн., па разьліку паміж дзяржаўнымі ўстановамі і гандлем, каапэрацыяй і г. д., прадугледжвае безнаяўныя разьлікі. Разам з тым перад намі стаіць задача ахапіць, як мага шырэй, безнаяўнымі разьлікамі таксама і працоўнае насельніцтва. Гэта натуральнае патрабаваньне нашай праграмы, натуральнае жаданьне яшчэ больш рацыяналізаваць нашу фінансавую гаспадарку.

Але ў гэтым пытаньні пры пераходзе на безнаяўныя разьлікі мы павінны мець рад умоў. Трэба ўлічваць тое, што пераход на безнаяўны разьлік, хаця і дае эфэкт, але ў некаторых выпадках ён патрабуе значнага павялічэньня тэхнічнага апарату. Я прыведу такі прыклад: адзін з заводаў, які мае закрытыя разьмеркавальнік, хацеў перайсьці выключна на безнаяўны разьлік і аказалася, што гэта патрабуе 50-60 лішніх рахункоўных работнікаў. Такія моманты трэба ўлічваць. Трэба выходзіць з таго, што на безнаяўны разьлік мы можам пераходзіць толькі ў тым выпадку, калі гэта падрыхтавана, калі гэта не кладзецца вялікім накладным выдаткам на фінансавы плян.

Па-другое, адначасова ўлічыць работу такім чынам, каб пераход на безнаяўны разьлік не ствараў новых таварных пробак, бо ў залежнасьці ад шпаркасьці рэалізацыі тавараў залежыць паступленьне быстрай наяўнасьці ў касу, а значыцца ня можа быць пінкага доўгага затрыманьня.

Самай лепшай сыстэмай для пераходу на безнаяўны разьлік зьяўляецца наша ашчадная сыстэма. Тут мы можам атрымаць больш выразнасьці ў рабоце, менш накладных выдаткаў і больших гарантый ад злоўжываньняў.

Таму, не аслабляючы работы па ўвядзеньні безнаяўных разьлікаў, трэба ўлічыць гэты тры моманты і, асабліва падкрэсьліваю, скарыстаць той апарат ашчадных кас, які мы маем, не ствараючы апарату, які дорага каштуе, і лішніх пробак пры бранізваньні тавараў.

Ахапіць пазынай шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-адзінаасобнікаў

Поўнасьцю выканаць дадатковыя кантрольныя лічбы

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту пры ЦВК БССР паслала ўсім райвыканкомам, гарсаветам і камсадам за подпісам старшыні камісіі тав. Вансоўскага наступную тэлеграму: «Прапануем разгарнуць шырокую кампанію на распаўсюджаньні пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», забясьпечыўшы выкананьне дадатковых кантрольных лічбаў. Галоўную ўвагу зьвярнеце на работу ў вёсцы. Дабецеся выкананьня кантрольных лічбаў па распаўсюджаньні пазыкі ў вёсцы на прапягу студзеня — лютага, галоўным чынам, за наяўны разьлік. Прымеце меры да поўнага ахопу калгасьнікаў. Разгарнеце грамадзкую ўзьдзейнасьць на кулацка-заможную частку. Пераводзьце на баявыя тэмпы работу ўсіх камсадаў».

Рапарт фізкультурнікаў Х-му зьезду ЛКСМБ

10-га студзеня ў Менск прыбылі бабруйскія і гомельскія фізкультурнікі— удзельнікі лыжных эстафэт, прысьвечаных Х-му зьезду ЛКСМБ. Лыжнікі перадалі зьезду рапарты аб удзеле бабруйскіх і гомельскіх фізкультурнікаў у сацбудаўніцтве.

У гэты-ж дзень адбылася агульна-гарадзкая дэманстрацыя менскіх лыжнікаў разам з удзельнікамі эстафэт. У дэманстрацыі прынялі ўдзел каля 1.500 фізкультурнікаў.

Менскія фізкультурнікі ўнесьлі 1.000 руб. на пабудову трактара імя Х-га зьезду ЛКСМБ.

Апарат Наркампаштэлю не пераключыўся на новыя мэтады работы

Распаўсюджаньне газэт ідзе самацёкам

Да 1931 году работа па распаўсюджаньні газэт і часопісяй праводзілася як самімі выдавецтвамі, так і апаратам Наркампаштэлю.

Пастановай СНК (ад 16 жніўня 1930 г.) уся справа распаўсюджаньня перадана НКПіТ. **Таму работу па падпісцы на 1931 г. праводзіць выключна сэктар друку Беларускага кіраўніцтва сувязі.** Трэба адзначыць, што ў работнікаў выдавецтваў была думка, што сэктар друку да гэтай работы, як належыць, яшчэ не падрыхтаваны.

Практыка паказала, што думка выдавецтваў апраўдваецца, — сэктар друку ня справіўся з пастаўленай перад ім задачай. Падамо факты: у студзені тыраж «Зьвязды» складае (бяз г. Менску) 24.600 экз. супроць 27.000 экз. у сьнежні. У той час, як з сьнежня 1929 году на студзень 1930 году тыраж «Зьвязды» павялічыўся з 17.000 экз. да 23.300 экз. (бяз Менску); газ. «Орка» (на польской мове) у студзені 4.800 экз. супроць 5.600 экз. у сьнежні; газ. «Беларуская Вёска» ў студзені 59.000 экз. супроць 74.000 экз. у сьнежні.

Такі недапушчальны ўпад тыражоў газэт можна вытлумачыць толькі тым, што сэктар друку бязьдзейнічаў, ён займаўся ўсім, але толькі не распаўсюджаньнем газэт. Тлумачыцца гэта і тым, што апарат Наркампаштэлю не пераключыўся на новыя мэтады работы, а працуе па-старому. Работа па распаўсюджаньні носіць характар выпадковасьці і самацёку. Масава-тыражная работа адсутнічае.

* * *

Падпіска на «Зьвязду» асабліва зьнізілася па сельскіх газэтных вузлох. **СЕМДЗЕСЯТ ПЯЦЬ СЕЛЬСКІХ ГАЗЭТНЫХ ВУЗЛОЎ У СТУДЗЕНІ ЗНАЧНА ЗЬНІЗІЛІ ПАДПІСКУ** (супроць сьнежня). **У большасьці вузлоў — зьніжэньне катастрафічнае.** Па чатырох вузлох падпіска больш-менш стабілізавалася; чатыры далі нязначнае павялічэньне і **толькі пяць выканалі свае студзеньскія заданьні.**

Стан падпіскі і **«выкананьне» кантрольных лічбаў па асобных газэтных вузлох** характарызуюць наступныя лічбы. Так, па **Дубровенскім** газэтным вузле на студзень выпісваецца 166 экз., «Зьвязды» супроць 304 экз. у сьнежні; па **Рагачоўскім** — 229 экз. супроць 326 экз.; па **Лоеўскім**—39 экз. супроць 96 экз.; па **Стара-Дароскім** — 90 экз. супроць 140 экз.; па **Азарыцкім** —65 экз. супроць 99 экз.; па **Камарынскім**—40 супроць 74 экз.; па **Ўраравіцкім**—111 экз. супроць 168 экз.; па **Хойніцкім**—82 экз. супроць 155 экз.; па **Расонскім**—41 экз. супроць 77 экз.; па **Пухавіцкім**—265 экз. супроць 395 экз.; па **Смалявіцкім**—152 экз. супроць 240 экз.; па **Сьмілавіцкім**—287 экз. супроць 402 экз.; па **Самахвалаўскім** — 241 экз. супроць 329 экз.; па **Цэрахаўскім**—63 экз. супроць 126 экз.; па **Бярэзінскім** — 156 экз. супроць 245 экз.; па **Копыльскім**— 207 экз. супроць 276 экз.; па **Клюсскім** —164 экз. супроць 216 экз.; па **Горкаўскім**—385 экз. супроць 455 экз.; па **Быхаўскім**—159 экз. супроць 228 экз.; па **Клімавіцкім** — 81 экз. супроць 133 экз.; па **Чырвонапольскім** — 58 экз. супроць 98 экз.; па **Нараўлянскім**—77 экз. супроць 145 экз.; па **Парыцкім** — 86 экз. супроць 131 экз.; па **Брагінскім** —74 экз. супроць 285 экз.; па **Кралінскім**—128 экз. супроць 178 экз.; па **Каптакевіцкім**—92 экз. супроць 135 экз.; па **Жлобінскім** — 216 экз. супроць 285 экз. і г. д.

Па Мсьціслаўскім, Дрыбінскім, Ушацкім і Багушэўскім газэтным вузлох тыраж стабілізаваўся.

Павялічылі падпіску Слуцкі газ. вузел на 20 экз., Чэрэйскі — па 20 экз., Глускі—па 12 экз. і Сіроцінскі — на 9 экз.

Выканалі заданьне (студзеньскае) Коханаўскі, Старобінскі, Крупскі, Чавускі і Талачынскі газвузлы.

Па буйнейшых гарадох стаіць справа так: **па газбюро Магілева** падпіска зьнізілася на 16 экз., **па газбюро Мазыра**— на 21 экз., **па газбюро Воршы**—на 10 экз.

Газбюро г. Віцебску павялічыла тыраж на 580 экз., газбюро Гомелю—на 360 экз. і газбюро Бабруйску — на 75 экз.

Вось «дасягненьні» раённага паштовага апарату і сэктару друку Бел. кіраўніцтва сувязі ў рабоце па распаўсюджаньні, дасягненьні, якія ні ў якім разе не адпавядаюць узрастаючым культурным запатрабаваньням працоўных мас.

Пераключыцца на новыя мэтады работы, забясьпечыць належным кіраўніцтвам і інструктажам газвузлы і газэтныя бюро, укамплектаваць газвузлы адпаведнымі работнікамі—вось асноўныя задачы, што стаяць перад сэктарам друку. Трэба наладзіць пастаянную сыстэматычную сувязь з газвузлямі, больш выяжджаць на пэрыферыю для правядзеньня нарад, ня толькі фіксаваць недахопы ў рабоце месц, але практычна дапамагаць зьнішчаць іх. **Трэба дабіцца такога становішча, каб райарганізатар не займаўся канцылярышчынай, пісанінай адрасоў, а часам і сартаваньнем газэт, а выконваў сваю асноўную задачу—тыражна-масавую работу.** П.

МЕНСК

Усебеларускі зьлёт „25-тысячнікаў"

Сёньня ў Доме Селяніна адкрываецца ўсебеларускі зьлёт рабочых - «25-тысячнікаў», працуючых у калгасах БССР. У зьлёце прыме ўдзел каля 350 «25-тысячнікаў». У парадку дня: вынікі сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і чарговыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва; ход калектывізацыі, падрыхтоўка да веснавой сяўбы і задачы «25-тысячнікаў»; аб сувязі прадпрыемстваў з «25-тысячнікамі».

Зьлёт працягнецца 3 дні.

За 8 дзён кампаніі сарваліся 34 сходы

Нізавыя прафарганізацыі дрэнна падрыхтоўваюць справаздачныя сходы

Прэзыдыум гарсавету адзначыў, што за 8 дзён справаздачнай кампаніі сарваліся 34 сходы, галоўным чынам, з-за няўмеласьці выбаршчыкаў. Такое становішча сыгналізуе аб слабай падрыхтоўцы з боку прафсаюзных арганізацый да справаздачнай кампаніі.

Прэзыдыум пастанавіў прасіць ЦСПСБ і гарком КП(б)Б даць адпаведныя ўказаньні нізавым партыйным і прафсаюзным арганізацыям прыняць усе меры да забесьпячэньня 100-процантнай явкі выбаршчыкаў на справаздачныя і выбарчыя сходы. Тыя дакладчыкі, па віне якіх сарваліся сходы, будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Для ажыўленьня ходу справаздачнай кампаніі гарсавет склікае шырокую нараду фабкомаў, заўкомаў, мясцкомаў, камісій садзейнасьці і рабкораў.

У вячэрні час у сакратарыяце гарсавету ўстанаўляецца дзяжурства членаў прэзыдыуму і на менш двух дакладчыкаў з мэтай недапушчаньня зрыву справаздачных сходаў.

За дзень

— **ВСФКБ** пастанавіў распаўсюдзіць сіламі фізкультурнікаў ня менш 20 проц. білетаў 5 усесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму.

— **Белкаапсаюз** заключыў дагавор з Барысаўскім заводам **«Чырвоны мэталіст»** на выпрацоўку 5.000 тэрмасоў і 350.000 лыжак для грамадзкага харчаваньня.

— У сувязі з пераводам вэнэрычнай клінікі ў клінічны гарадок, гарсавет пастанавіў перадаць памяшканьне клінікі пад дзіцячыя ясьлі.

Па Савецкай Беларусі

Нахабная вылазка клясавага ворага на заводзе імя Халтурына

Распусьціць бюро ячэйкі і заўком, якія замазвалі антысэміцкія выступленьні

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). **На лесапільным заводзе імя Халтурына** меў месца абураючы факт антысэмітызму. Рабочыя заводу **Бацюшкоў, Прывалаў і Хаткевіч** сыстэматычна зьдзекваліся над рабочымі-яўрэямі—**Альшанскім і Ясінавым.** Антысэміты зрабілі з дрэва крыж і прымушалі Альшанскага цалаваць яго, намазвалі губы Альшанскага салам і прымушалі аблізваць іх. Адпойчы, калі рабочы Ясінаў спаў, антысэміты засунулі яму ў нос гарэлую паклю, потым узялі лейку з аліянафтам і лілі на галаву Ясінава.

Працоўныя Рагачова глыбока абураны вылазкай клясавых ворагаў. У рэзалюцыях, вынесеных на агульных сходах, рабочыя патрабуюць прыцягненьня антысэмітаў да суровай адказнасьці.

Партыйная ячэйка і заўком лесазаводу імя Халтурына ня здолелі даць правільную палітычную ацэнку гэтаму факту. У адносінах да антысэміта Бацюшкава, які, да рэчы, ужо раз быў асуджаны да пазбаўленьня волі за зьдзекі над яўрэйкай, парт'ячэйка і заўком абмежаваліся вынясеньнем вымовы.

Рагачоўскі райком КП(б)Б за недаацэнку палітычнага значэньня антысэміцкага ўчынку Бацюшкава, Прывалава і Хаткевіча абвясьціў партыйнай ячэйцы і фракцыі заўкому вымову.

Ад рэдакцыі: Мы лічым меры, ужытыя ў адносінах да бюро ячэйкі і заўкому заводу, якія змазваюць палітычнае значэньне вылазкі антысэмітаў, зусім невыстарчальнымі. Бюро ячэйкі і заўком павінны панесьці суровае спагнаньне. Трэба бязьлітасна пакараць агентаў клясавага ворага, якія прасяклі на завод і пад маскай рабочых - дрэваапрацоўшчыкаў тварылі агідную контр-рэвалюцыйную справу.

Да адказнасьці галавацяпаў

ЧАЧЭРСК. (Наш. кар.). Чачэрскае спажывецкае таварыства ня цікавіцца мабілізацыяй сродкаў. У крамах ёсьць вялікія запасы розных тавараў, а праўленьне т-ва ня ўжывае мер для іх рэалізацыі.

4-га студзеня ў Чачэрску адбыўся кірмаш. Як раз у гэты дзень, калі была магчымасьць рэалізаваць вельмі шмат тавараў, **амаль усе крамы былі зачынены.** Галавацяпы з праўленьня спажыўтаварыства прызначылі на гэты дзень рэвізію ва ўсіх крамах.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве мабілізацыі сродкаў і ў стварэньні вялікіх таварных накладаў.

Праверка сацдагавору на лепшае правядзеньне перавыбараў гарсаветаў

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). Гэтымі днямі ў Віцебск выехала спэцыяльная брыгада для азнаямленьня з ходам справаздачна-перавыбарчай кампаніі Віцебскага гарсавету. Брыгада праверыць выкананьне сацыялістычнага дагавору, заключанага паміж прафсаюзамі Гомелю і Віцебску на лепшае правядзеньне перавыбараў. У склад брыгады ўваходзяць прадстаўнікі гарпрафсавету, гарсавету і газэты «Палеская Праўда».

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **Навуковая асацыяцыя дактароў.** У 20 гадз., у вочнай клініцы — чарговае пасяджэньне вочнай сэкцыі пры навуковай асацыяцыі дактароў. Парадак дня: 1) Дэманстрацыя хворых. 2) Д-р Д. В. Кантор «Некаторыя даныя аб нарэшчатасьці трахомай насельніцтва Лагойскага раёну і канкрэтны плян барацьбы з трахомай у БССР». 3) Бягучыя справы.

ЗАЎТРА

— **Камвуз.** У 19 гадз. — пасядж. т-ва гісторыкаў-марксыстаў. У парадку дня — даклад т. Дудкова — «Аб нашаніўскім пэрыядзе». Прысутнасьць членаў т-ва і асьпірантаў-гісторыкаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

— **Навуковая асацыяцыя.** У 19 гадз. мэдыка-біялёгічная сэкцыя навуковай асацыяцыі склікае чарговы сход. Парадак дня: 1) Даклад Лябёдкіна — «Узаемаадносіны антагеніі і філёгеніі і біягенэтычны закон. 2) Даклад Розанава «Уплыў дражджэй на рост пацукоў».

— **ПК ЦКК КП(б)Б даводзіць да ведама т. т., якія апэлююць на пастановы ЦКК КП(б)Б, што вынясная тройка ЦКК УсеКП(б) пачне сваю працу па разглядзе партспраў з 13-І—1931 г. у г. Менску.**

Разгляд партспраў будзе праводзіцца наступным парадкам:

На 21-—31 г., у 10 гадз. ран.: Бабіч П. Д., Бораш П. С., Астапенка П. А., Навіцкі А. П. (Рэчыцк. арг.), Гярашчанка Я. М., Гярасімаў М. М., Цырлін Л. А. (Гомельск. арг.), Кулеш Р. Ф., Масевіч В. А. (Менск. арг.), Шэйнман І. І., Шэйнман І. Ш. (Мазырск. арг.), Федасеў Я. А. (Барысаўск. арг.), Раўпейка П. С. (Заслаўск. арг.), Маркін Б. С. (Бабруйск. арг.), Русіновіч П. Я. (Парыцк. арг.).

На 22-І—31 г., у 10 гадз. ран.: Станэўскі К. М. (Асіпавіцк. арг.), Галкін Е. Ф., Дворкін Я. М., Сьняжкоў А. А., Малеў М. М. (Гомельск. арг.), Буракоў М. Я. (Рэчыцк. арг.), Дубпець Д. А. (Бабруйск. арг.), Цузакевіч В. Я. (Жлобінск. арг.), Радкевіч Я. С., Худавец П. А., Магідаў А. С. (Бабруйск. арг.), Шырае А. М. (Слуцк. арг.), Гранчык Р. А. (Чэрвенск. арг.), Давыдовіч Д. Я. (Бярэзінск. арг.), Корба С. Р. (Ураравіцк. арг.).

На 23-І—31 г., у 10 гадз. ран.: Сідарэнка П. І. (Барысаўск. арг.), Фідарэнчык Я. С. (Бярэзінск. арг.), Салей А. Ф. (Коханаўск. арг.), Ланіцкі С. Н. (Дубровенск. арг.), Белавусаў З. Я., Ананеў Р. К., Суворaў М. М. (Аршанск. арг.), Костка М. Я. (Гомельск. арг.), Грышчанка Я. Р. (Полацк. арг.), Робкавец С. Б., Сьпявак М. А., Баркоўскі Я. А., Гурэвіч Б. Е., Гольдзін М. Я. (Мазырск. арг.), Робак А. А. (Азарыцк. арг.).

На 24-І—31 г., у 10 гадз. ран.: Сідзельнік А. Р. (Мазырск. арг.), Ярмакоў Я. П., Дземчанка Я. Р. (Полацк. арг.), Сабіла С. М., Эпштэйн М. Н., Фейгельман Я. Л., Панасевіч В. Л., Каптарокін С. З., Эльляшаў С. О. (Менск. арг.), Кіцкаў М. Л., Чулракоў П. Я., Золатарэнка Н. В., Панамароў Х. Т. (Гомельск. арг.).

На 25-І—31 г., у 10 гадз. ран.: Вялікка В. А., Кохан А. А., Паўлаў П. І. (Аршанск. арг.), Грыбоўскі П. Х. (Бабруйск. арг.), Корсак М. Я. (Полацк. арг.), Юрэвіч В. Я., (Плешчаніцк. арг.), Крыноў П. М. (Віцебск. арг.), Даніленко Я. Я. (Клімавіцк. арг.).

Праезд—за ўласны кошт апэлюючы. Пры разглядзе спраў пажадана прысутнасьць прадстаўнікоў праверкомаў і сакратароў ячэек г. Менску.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рабкоры! Селькоры! Ваенкоры! Юнкоры!

Рэдкалегіі насьценгазэт! Рэдакцыі раённых газэт!

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, пачынае выходзіць раз у пяць дзён кіруючы орган рабселькораўскага руху БССР—газэта „РАБСЕЛЬКОР" —орган культпрокту ЦК КП(б)Б, выданьне газэты „ЗЬВЯЗДА". Месячная падпісная плата—20 кап. Падпіска прымаецца ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах БССР. Кожны рабселькор, кожная рэдкалегія—павінны быць удзельнікамі і падпісчыкамі газэты „РАБСЕЛЬКОР".

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Ад панядзелка, 12 студзеня
1. ВОСТРАЎ БЕГЛЯКОЎ — драма ў 6 частках.
2. Глядзі ў корань — кіно-фільм.
3. Замежны гукавы кіно-фільм ЧЭМПІЁНЫ ПЛАВАНЬНЯ
Пачатак сэансаў а 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. увеч.
Каса адчынена з 5 гадз. веч.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня, 13 студзеня—спэктакль для саюзу саўгандаслужачых.
„ПЕРШАЯ КОННАЯ"
Пачатак у 8 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
Лепшы фільм сэзону з эпохі грамадзянскай вайны
ТАБЕ ДАРУ
драма ў 6 разьдзелах.
Кіно-хроніка „Саюзкіно" № 64.
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м., 10 г. 20 м.
Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал"
Шкавы фільм паводле водэвіля апавяданьня Шолем-Алейхема
ЯЎРЭЙСКАЕ ШЧАСЬЦЕ
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — часопіс „Саюзкіно" № 63.
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Амэрыканскі прыгодніцкі фільм
ЧОРНЫ ЦЫКЛЁН
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Кінацэрна сёньня
„ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВАЛЯТА"
кіно-аповесьць у 6 част.
Пачатак: 1 гадз., 2 гадз. і 3 гадз. дня.
Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „Спартак"
Зьвыш праграмы тэатральнага тэатру С. ЮС ЗЕЛЯНЫ — на экране
ПАЛАЧЫ
ў 7 частках з пралёгам.
Пачатак 7 г., 9, 11 гадз.
Каса—з 5 гадзін.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА".
Сёньня, 13-га студзеня
ВЕЧАР МЕНСАМПРАМСАЮЗУ.
Білеты на сёньня не прадаюцца.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ імя Карла Маркса
Дом Камасьветы разам з таварыствам вазаўвічных матарыялістаў-дыялектыкаў паладжвае сёньня, а 7 в цал. гадз. веч. вялікі дыспут на тэму:
„РЭЛІГІЯ І НАВУКА"
(да вынікаў дыскусіі сярод навуковых працаўнік.).
Уступнае слова праф. Вальфсона.
Удзельнічаюць: т.т. Арнацкі, Вазабрынскі, Галаева, Рыўлін, Крывіцкі, Павкевіч. Білеты па арганізацыях і ў чытальні дому.
Запрашаюцца прадстаўнікі друку.

Усе студэнты мэлфаку
Беларускай дзяржаўнай с.-г. акадэміі датэрміновага выпуску 10 мая 1931 г.
павінны абавязкова зьявіцца ў Акадэмію да 20 студзеня 1931 г.
для праходжаньня курсу «Гідратэхнічныя пабудовы»
Дырэктар акадэміі Пінчук.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЭРСЫТЭТ
АБВЯШЧАЕ
КОНКУРС
на замяшчэньне нізэйпералічаных катэдр на факультэце народнае гаспадаркі.
1. Катэдра плянаваньня. Адна дацэнцкая, дзьве асыстэнцкія вакансіі (дысцыпліны: мэтадалёгія плянаваньня народнае гаспадаркі, мэтадалёгія і тэхніка ўнутры прамысловага плянаваньня, мэтадалёгія і тэхніка плянаваньня сельскай гаспадаркі; мэтадалёгія і тэхніка плянаваньня абмену і разьмеркаваньня; мэтадалёгія назіраньня кан'юнктуры; плянаваньне крэдыту).
2. Катэдра эканомікі прамысловасьці. Дзьве дацэнцкія вакансіі (дысцыпліны: галінная эканоміка; мэтадаграмысловасьці, тэкстыльная, гарбарная, абутковая і дрэваапрацоўчая прамысловасьці, эканоміка дробнай прамысловасьці).
3. Катэдра тэхнічных дысцыплін. Адна прафэсарская (загадчык катэдры), адна дацэнцкая і адна асыстэнцкая вакансіі (дысцыпліны: агульна-прыкладная механіка, машынабудаваньне, электратэхніка, энэргетыка, тэхналёгія валакнистых матар'ялаў, плянаваньне мэтаўчага працэсу, тэхна-эканамічнае праектаваньне).
4. Катэдра статыстыкі. Адна асыстэнцкая вакансія (дысцыпліны: асноўныя праблемы народнагаспадарчай статыстыкі, фінансавая статыстыка).
5. Катэдра фінансавых дысцыплін. Адна дацэнцкая або асыстэнцкая вакансія.
6. Катэдра навігацыі. Адна дацэнцкая або асыстэнцкая вакансія (дысцыпліны: плянаваньне спажывецкай навігацыі, плянаваньне ў сэматурна-прамысловай навігацыі, грамадзянскі кантроль, інструктаж і рэвізія, Арганізацыя і мэтодыка культурна-бытавой работы і інш.).
7. Заява з кароткім жыцьцяпісам і пералікам навуковых прац павінны быць накіраваны на імя рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту (г. Менск, Унівэрсытэцкі гарадок) да 15-га лютага 1931 г.
Рэктар БДУ Наранёўскі.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на ЛЮТЫ і далейшыя месяцы 1931 г. —) НА ГАЗЭТУ (— „ЗЬВЯЗДА"
Падпіска прымаецца ўсюды на ПОШЦЕ

Газэта „ЗЬВЯЗДА" з 1-І-1931 г. ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА ва ўсе дні тыдня
Падпісная цана—1 р. у м

У сераду, 14 студзеня, роўна ў 7 гадзін вечару
ГАРСАВЕТ СКЛІКАЕ НАРАДУ
старшынь фабзаўкомаў, групкомаў, мясцкомаў, камісій садзейнасьці на прадпрыемствах па правядзеньні спрасаздачна-перавыбарчай кампаніі савету, рабкораў і актыву вылучаных саюзам для работы ў савеце.
Нарада адбудзецца ў памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету (пляц № 4, 3-ці паверх).
Просьба да ўсіх таварышоў, пералічаных вышэй, зьявіцца на нараду без спазьненьня.
ГАР. ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты
пічыць несапраўднымі

Парт. біл. № 1296296 Мен. АК КП(б)Б Крэпскага А., 3496; ас. кн. Станьк. РВК Саўка Г. Д., 3497; вайск. кн. Чэрык. РВК Калошкі А. Ф., 3498; чл. біл. с. харч. № 4816 Этуш І. І., 3499; лек. кн. Пацкоўскага Ф. А., 3500; дам. кн. д. № 12 па 2 Грыгор. зав. Давідава Е., 3501; канд. карт. № 2161 Валоўск. РК УсеКП(б) Мінаева З. С., 3502; лек. кн. Менстрахкасай Бухбіндэра І. В., 3503; вайск. кн. Менваен., дав. аб маем. Бярэз. с.-с. Жукоўскага А. І., 3504-3505; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Місуна М. У., 3506; ас. пасьв. № 201/к МБВ ч. Кутай У. Ф., 3507; вайск. біл. Медыц. ваенк., студ. пасьв. 6 мес. курс. дзес. пры НКП Ігнатава М. І., 3508-3509; вайск. біл. аддз. эск. сувязі, чл. біл. с. чыг. Шлеміна Г. Ф., 3510-3511; чл. кн. Мен. т-ва самат. харч. Брэславай Е., 3513; чл. біл. с. СГС Мелянкевіч Я. С., 3514; дав. аб пр. ПРД, бірж. карт.